ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -ядатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсактар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

СЕРАДА 4 чэрвеня 1930 г.

№ 129 (3727)

Год выданьня — XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

АД XV—ДА XVI ЗЬЕЗДУ УсеКП(б)

ДАКЛАД Д. З. МАНУІЛЬСКАГА НА XIII ЗЬЕЗЬДЗЕ КП(б)Б

Міжнароднае становішча

1. Уводзіны

Таварышы! Ад імя Цэнтральнага Камітэту Усесаюзнай Камуністычнай Партыі, ад імя Выканаўчага Камітэту Камуністычнага Інтэрнацыяналу вітаю XIII зьезд Камуністычнай партыі Беларусі і ў вашай асобе працоўных Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі! (**Бурныя аплёдысмэнты**).

За два з паловаю гады, што мінулі з часу XV партыйнага зьезду, адбыліся падзеі буйнейшага міжнароднага і ўнутранага палітычнага значэньня.

За гэты час разразіўся сусьветны эканамічны крызіс, які выклікае самыя цяжкія вынікі для ўсяго гаспадарчага палітычнага жыцьця капіталістычнага сьвету. Рэзка абастрыліся як зьнешнія, так і ўнутраныя супярэчнасьці ўсёй імпэрыялістычнай сыстэмы, узмацнілася клясавае змаганьне ва ўсім сьвеце. Пачынаючы з 1928 году, стаў усё больш выразна абазначацца нарастаючы рэвалюцыйны пад'ём, які выліваецца ў хвалю забастовак, дэманстрацый, а дзе-нідзе і ў пакуль яшчэ разрозьненыя рэвалюцыйныя паўстаньні ў калёніях.

Зноў, таварышы, Кітай становіцца плацдармам вялікіх рэвалюцыйных баёў. І той край, аб якім на X пленуме ВККІ мы гаварылі, што ён зьяўляецца вогнішчам грандыёзных рэволюцыйных падзей—Індыя, праведзены ў цяперашні час у вялікі рух.

За гэтыя гады яшчэ больш умацаваліся комуністычныя партыі, адбыліся [illegible] іх ад цэлага раду опортуністычных элементаў. Бадай з гэтымі буйнейшымі падзеямі і з рухамі ў міжнароднай абстаноўцы адбываўся прыход далейшага ўмацаваньня краю пралетарскай дыктатуры, разгортвалася нябачанае ў сьвеце соцыялістычнае будаўніцтва, ажыцьцяўляўся наш пяцігадовы плян, разгарнулася колектывізацыя нашай сельскай гаспадаркі. Мы бачым, што побач з рэволюцыйным пад'ёмам у капіталістычных краёх разгарнуўся вялікі пад'ём рэволюцыйнай энэргіі энтузіязму працоўных у нашым краі. Мы павялі на ўсіх лініях наступленьне на капіталістычныя элементы гораду і вёскі. Мы перайшлі ад політыкі абмежаваньня кулацтва да політыкі ліквідацыі кулацтва як класы. На фоне гэтай супярэчнасьці дзьвюх сусьветных сыстэм—будуючагася соцыялізму і капіталізму, які ідзе да сваёй пагібелі,—вырасла ваенная небясьпека супроць Савецкага Саюзу, адна за аднэй ідуць у гэтыя гады правакацыі ў адносінах да савецкай дзяржавы. Мы перажылі з вамі конфлікт на Ўсходнім-Кітайскай чыгунцы. Мы мелі папярэджаную спробу выбуху ў Варшаўскім поўнаможным прадстаўніцтве. І мы бедаем, што рад провакацый далёка ня скончыўся. Але ў гэтыя бурныя гады вялікага пералому, у гады рэволюцыйнага пад'ёму праявілася з асаблівай сілай тая найманейшая зьлітнасьць, якую мае наша партыя і савецкая ўлада з працоўнымі нашага краю.

Усе гэтыя ўсьпехі былі-б немысьлімы без таго найвялікшага энтузіязму, бяз тэй агромнай ініцыятывы, якую праявіла рабочая кляса; усе гэтыя пашы найвялікшыя дасягненьні былі-б немагчымы, калі-б наша партыя не разгарнула ў найглыбейшых нетрах працоўных самакрытыку, калі-б рабочая кляса не стварыла новых форм соцыялістычнага будаўніцтва, калі-б яна не ажыцьцявіла ідэі соцыялістычнага спаборніцтва, калі-б яна ня стала разьвіваць ударніцтва гэтых новых мэтодаў сьвядомай комуністычнай працы. На гэтым фоне, дзякуючы існаваўшай у нашым асяродзьдзі наймацнейшай зьлітнасьці мы за 2 з паловай гады зрабілі вялізную работу ў справе ўмацаваньня і консалідацыі нашай партыі, ажыцьцяўленьня нашых задач.

Мы разьбілі дашчэнту ня толькі рэшткі троцкісцкіх груп, м ы нанесьлі найцяжэйшае паражэньне ўсім правым элементам у нашай партыі.

Але, таварышы, усе гэтыя ўсьпехі былі дасягнуты не без таго, каб на розных вучастках фронту клясавага змаганьня ў нас ня было паасобных недахватаў і прарываў.

Паўстаў у апошні час надзвычайна востра пытаньне аб стопроцантным выкананьні прамфінпляну, аб далейшым зьніжэньні сабекошту, аб падвышэньні якасьці продукцыі аб паленшаньні рабочага забесьпячэньня. У той-жа час пры практычным правядзеньні шырока разгорнутага процесу колектывізацыі быў зроблены цэлы рад сур'ёзных політычных памылак як толькі радавымі таварышамі, але нават паасобнымі адказнымі работнікамі вобласьцяй, а таксама і паасобнымі членамі Цэнтральнага Камітэту партыі.

Мы павінны сягоньня падвесьці балянс усёй нашай політыцы. У сьвятле накопленага намі дасьведчаньня мы павінны будзем сягоньня вызначыць, ці правільнай была генэральная лінія партыі. Калі падагуліць зараз усе тыя пытаньні, якія ў гэтыя два з паловаю гады стаялі ў цэнтры нашай увагі, мы ўбачым, што гутарка ідзе аб трох вузлавых момантах усёй міжнароднай і нашай унутранай політыкі. Гэта—пытаньне аб сусьветным, капіталістычным крызісе, пытаньне аб нашым пяцігадовым пляне, пытаньне аб пераходзе ад політыкі абмежаваньня кулацтва да політыкі ліквідацыі яго, як клясы, на аснове суцэльнай колектывізацыі. Гэтыя пытаньні нельга аддзяляць адно ад аднаго, бо, паколькі эканомічны крызіс аслабляе цяпер позыцыі сусьветнай буржуазіі, зусім зразумела, што ўзмацняюцца позыцыі міжнароднага пролетарыяту, а значыцца ўзмацняюцца позыцыі краю пролетарскай дыктатуры, і, з другога боку, паколькі мы ў нашым краі за апошнія два з паловай гады дабіліся найвялікшых усьпехаў, — мы ўмацавалі цяпер позыцыі ўсяго сусьветнага рэволюцыйнага руху, мы стварылі ўсе прадпасылкі для пераходу ў контрнаступленьне на фронце міжнароднага клясавага змаганьня.

2. Сусьветны эканомічны крызіс

Я пераходжу да першай часьці майго дакладу, да пытаньня аб сусьветным крызісе.

XIV партыйны зьезд характарызаваў тагачаснае сусьветнае становішча, як перыяд больш або менш доўгай «перадышкі», якая абярнулася ў цэлым у перыяд, так званага, «мірнага сужыцьця СССР з капіталістычнымі дзяржавамі». Але ўжо XV зьезд павінен быў устанавіць, што, ня гледзячы на праводжаную капіталізмам тэхнічную рэконструкцыю, намячаецца развал капіталістычнай стабілізацыі. Сусьветны эканомічны крызіс, які абазначаўся на зыходзе мінулага году, яскрава апраўдаў аналіз даны XV парт. зьездам, а пасьля рашэньнямі Цэнтральнага Камітэту нашай партыі і рашэньнямі прэзыдыуму ВККІ.

Сусьветны эканамічны крызіс падвядзіць цяпер агул тым дыскусіям і спрэчкам, якія мы мелі ў Камуністычным Інтэрнацыянале і, у часнасьці, унутры нашай партыі па пытаньні аб характары капіталістычнай стабілізацыі.

Вы памятаеце, таварышы, што ўжо ў момант VI Сусьветнага конгрэсу пачалі раздавацца галасы аб тым, што, у выніку тэхнічай рэконструкцыі, якую ажыцьцяўляе капіталізм, у выніку падвышэньня продукцыйнай моцы яго гаспадарчага апарату, капіталістычная стабілізацыя стала больш моцнай. Ужо на VI Сусьветным конгрэсе ў тую рэзолюцыю, якую ўнёс т. Букарын па асноўным пытаньні — аб ацэнцы бягучага моманту, — руская дэлегацыя навінна была ўнесьці сур'ёзную і значную папраўку. Сусьветны капіталізм пераступіў праз даваенны ўзровень, сусьветная тэхніка зрабіла значныя дасягненьні, але на аснове гэтага факту, таварышы мы, абастраюцца ўсе вьнешнія і ўнутраныя супярэчнасьці капіталізму, бо нарастае крызіс капіталістычнага перавытворства. Мы лічылі, што перыяд тэхнічай рэконструкцыі ў разьвіцьці капіталізму будзе ў той-жа час крыніцаю новых найвялікшых канфліктаў як на ўнутранай, так і на міжнароднай арэне.

Сусьветны эканомічны крызіс пацьвердзіў той аналіз становішча сусьветнага капіталізму, які быў даны нашым Цэнтральным Камітэтам і з якога выплывалі асноўныя тактычныя ўстаноўкі ва ўсёй лініі Комуністычнага Інтэрнацыяналу.

Той крызіс, які перажывае цяпер капіталістычная гаспадарка, зьяўляецца сур'ёзным патрасеньнем ня толькі эканомічнага, але і політычнага парадку.

Не забывайце, таварышы, што П-А. Зл. Ш. былі ў апошняе дзесяцілецьце станавым крыбтом усёй капіталістычнай стабілізацыі. П-А Зл. Ш. — гэта 50% усяго сусьветнага вытворства, гэта 70% усёй нафты, гэта 90% усяго аўтомабільнага транспарту. Амэрыка пасьля вайны грала кіраўнічую ролю ва ўсёй сусьветнай капіталістычнай гаспадарцы. Цяперашні сусьветны крызіс наносіць удар ня толькі сусьветнаму капіталізму, але і сусьветнаму рэформізму.

Сусьветны рэформізм арыентаваўся у першыня пасьляваенныя гады на 14 пунктаў праграмы Вільсона. У перыяд капіталістычнай стабілізацыі сусьветны рэформізм высунуў лёзунг «амэрыканізацыі» рабочага руху. Як галодныя сабакі, лісьліва паглядалі соцыял-дэмократы ўсіх масьцей і адрыкрызісную кан'юнктуру, існаваўшую там яшчэ да амэрыканскага крызісу.

Крызіс у Эўропе, які атрымаў такі моцны таўчок з Амэрыкі ў бок свайго далейшага разьвіцьця, быў абумоўлен агульнай хваробай капіталістычнай сыстэмы — у Эўропе на яго разьвіцьцё мае ўплыў і рад іншых фактараў: пасьляваенная раздробленасьць усходняй часьці капіталістычнай Эўропы, фэўдальныя перажыткі ў такіх краёх, як Польшча і Балканы, а таксама фінансавая залежнасьць капіталістычнай гаспадаркі цэлага раду дзяржаў, нацыянэўных паражэньне ў часе вайны ад сусьветнага імпэрыялізму.

Гэтыя прычыны абастрылі разьвіцьцё эўропэйскага крызісу. Калі мы паглядзім на разьвіцьцё за апошнія месяцы хоць-бы гарманскай гаспадаркі, мы павінны будзем канстатаваць, што і па вуглі, і па сталі гарманская гаспадарка ідзе ўніз: павялічваецца ў Гэрманіі колькасьць безработных, якая, паводле офіцыяльнай статыстыкі, ужо выражаецца лічбай каля 3 млн. чалавек.

Калі мы возьмем такі край, як Англія, то і тут мы наглядаем, што ён ахоплен пачынаючымся самым цяжкім крызісам. Я ня буду прыводзіць тут падробна лічбаў, але спашлюся толькі на аўтарытэтную думку аднаго чалавека, якому ў пытаньні аб становішчы ў Англіі мы ня маем падставы ня верыць, гэта міністар без портфэлю, які ўзваліў на сябе непасільную місію змаганьня з безрабоцьцем, пан Томас, —сакратар саюзу чыгуначнікаў.

Вядома, што пік офіцыяльна зарэгістраваных безработных у Англіі дайшоў да 1.739.000 чалавек. За год існаваньня ўраду Макдональда лік безработных павялічыўся ў Англіі на 600.000 чалавек.

Міністар змаганьня з безрабоцьцем Томас, які яшчэ нядаўна суліў налепшаньне эканомічнай кон'юнктуры, 19 мая ў Палаце абшчын павінен быў прызнаць: «становішча кепскае, яно робіцца ўсё горшым, прычыны безрабоцьця нельга ўстараніць сродкамі, што знаходзяцца ў руках чалавека, і таму нападкі на ўрад зусім лішнія».

Супешыць ён мог толькі паведамленьнем, што «ў Гэрманіі безрабоцьце за год вырасла з 3 да 4 млн. чалавек, што ў Амэрыцы 21 проц. членаў прафсаюзаў ня маюць работы, што ў Аўстраліі 14, а ў Канадзе 10 процантаў безработных, а ў Японіі за адзін апошні тыдзень зачынілася 935 фабрык».

Таварышы, калі пан Томас вымушаны цешыцца тым, што ў іншых капіталістычных краёх яшчэ горш, то гэта вясёлая міна на яго твары падобна да гумару шыбеньніка. З вуснаў Томаса мы чуем прызнаньне таго надзвычай цяжкага становішча, у якім знаходзіцца цяпер ангельскі капіталізм.

Возьмем край, які зьяўляецца нашым непасрэдным суседам, Польшчу. Польшча зьяўляецца тыповай дзяржавай Усходняй Эўропы, дзе ў пазіўнасьці і перажыткі фэўдалізму, і фінансавая залежнасьць ад больш магутнага імпэрыялізму, дзе ёсьць у пазіўнасьці надзвычай распухшы дзяржаўны паліцэйска-адміністрацыйны апарат, а нязносным бюджэтным цяжарам, узваленым на плечы працоўных мас. Польшча—гэта асколак усёй Вэрсальскай сыстэмы, бо тут можна прашчупаць становішча ўсяго міжнароднага капіталізму. Якаво становішча польскай гаспадаркі ў цяперашні час? Агульны паказальнік цэн акцый у 1926 г. складаў 106 проц., у 1930 г.—55 проц.,—за два гады зьнижэньне амаль на 50 проц. У лютым 1930 г. здабыча вугалю ў параўнаньні з папярэднім месяцам паменшылася на 21 проц., з нафтай — тая-ж карціна. У мэталюргіі, у тэкстыльнай прамысловасьці — усюды мы павінны канстатаваць пагоршаньне кан'юнктуры. 91 проц. тэкстыльных прадпрыемстваў у Польшчы ня маюць нагрузкі, або маюць вельмі нязначную нагрузку.

Для таго, каб даць нам ясную карціну становішча ў Польшчы, я спашлюся на заяву зноў такі нашага клясавага ворага. Я маю на ўвазе артыкул, што пазьвіўся 28 красавіка г. г. ў органе Корфанты ў Верхняй Сылезіі «Полёнія». Вось што піша орган Корфанты цяпер аб становішчы польскага капіталізму:

— «Больш 300.000 чалавек напружана шукаюць хлеба і работы. Другія 300.000 працуюць толькі некалькі дзён у тыдзень. Буйныя прамысловыя цэнтры прадстаўляюць сабою могільнік. Лодзь мёртвая, Беласток памірае, Беласток задыхаецца. Жалезная прамысловасьць у Польшчы, у часнасьці ў Сылезіі, прадстаўляе няпчасны від, з вугалем кепска, вельмі кепска. Унутраны і зьнешні рынак усё больш звужаецца».

І далей:

«У Польшчы ўсе азлоблены, расчараваны, поўны сумненьня. Некаторыя проста пылаюць помстаю, ня могучы дачакацца моманту рэваншу. Пад паверхняй гудзяць агні, жывем на вулькане, тым больш небясьпечным, што ня відаць паляпшэньня ні ў палітычных, ні ў гаспадарчых адносінах».

Калі пры такім становішчы польскі імпэрыялізм робіць спробы шляхам правакацыі стварыць напружаныя адносіны з нашым Савецкім Саюзам, запалохаць нас пагрозаю вайны, то мы, бязустанку рыхтуючы адпор польскаму імпэрыялізму, можам яму разам з тым і напомніць, што ў яго ня зусім супакойны і спрыяючы для вайны тыл.

Крызіс ахапіў ня толькі Амэрыку і Эўропу. Ён цяжэй за ўсё праявіўся на краёх мала разьвітых у эканамічных адносінах, на калёніях і паўкалёніях. Разьвіцьцю крызісу тут дапамагаў рад спэцыфічных умоў і перш за ўсё існуючы ў гэтых краёх монокультурны тып гаспадаркі. Сусьветны імпэрыялізм падтрымлівае такі падзел працы паміж калёніямі, які забясьпечвае яму эканамічнае панаваньне і асуджае калёніі на поўную эканамічную залежнасьць ад яго. Кожная калёнія вытварае той ці іншы лік сельска - гаспадарчай сыравіны, патрэбнай для вытворства Мэтраполіі. Так, 80 проц. вываз Эгіпту складае бавоўна. Індыя вывозіць таксама бавоўну, джут, масьлянічныя расьліны, Бразылія — каву, Чылі — салетру і г. д. Калі сусьветны капіталізм перажывае крызіс, адразу-ж пачынае цярпець крах і вытворства гэтых соцень мільёнаў дробных уласьнікаў, засяляючых залежныя краі і працуючых для сусьветнага рынку. Цяжкасьць крызісу ў калёніях і поўкалёніях павялічваецца яшчэ тэму, што там пераважна ўжываецца срэбная валюта. Вартасьць срэбра дае ў апошнія гады самую нізкую лічбу за апошніх сто гадоў. Таму мэксыканская срэбная прамысловасьць перажывае цяпер надзвычай цяжкі крызіс. У Кітаі ў цяперашні час ня толькі ня плацяць процантаў за срэбра, наадварот, укладчыкі, што уносяць у банк срэбра, павінны плаціць процант банкам. Зьніжэньне вартасьці срэбра надзвычай цяжка адбіваецца цяпер і на індыйскай валюце, рупіі. І гэта другая прычына, якая паглыбляе крызіс у калёніях і поўкалёніях.

Але асноўнай прычынай таго чаму крызіс у калёніях ін оўкалёніях прымае такія барбарскія формы, зьяўляюцца галоўным чынам існуючыя ў калёніях навейшыя драпежніцкія формы капіталістычнай эксплёатацыі, якая разьвіваецца на поўрабскай, поўфэўдальнай і фэўдальнай аснове.

Вось гэтыя тры тыпы краёў даюць агульную карціну стану ўсёй сусьветнай капіталістычнай гаспадаркі. З растучага ва ўсім капіталістычным сьвеце крызісу выплывае рад сур'ёзных вынікаў, якія абрысоўваюцца перад намі ў відзе памячаючыхся контураў аграмадненьшых зрухаў у міжнароднай палітыцы, найвялікшых зрухаў у сусьветным рабочым руху. Ужо цяпер па нашых вачох надзвычай абастраецца змаганьне за рынкі ва ўсім сьвеце—адбываецца тое, што мы прадракалі і раней. Гэта змаганьне разьвіваецца перш за ўсё паміж Злучанымі Штатамі і Вялікабрытаніяй ў Паўднёвай Амэрыцы, яно пачынае разгарацца ў Ангельскіх дамініёнах, яно пранікае ў Кітай, і заўтра яно пачне разьвівацца ў Індыі.

Цяпер Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты ўступаюць у паласку актыўнай імпэрыялістычнай політыкі. Не забывайце-ж, таварышы, што амэрыканскі вываз да гэтага году быў роўны ўсяго 8 проц. нацыянальнай продукцыі Амэрыкі. Павышэньне амэрыканскага вывазу хоць бы на 1 проц. па сваёй ўдзельнай вазе па сусьветным рынку бы ло-б роўна напрыклад усяму ангельскаму увозу ў краі Паўднёвай Амэрыкі. Гэту фазу ў разьвіцьці амэрыканскага капіталізму прадракаў Ленін яшчэ ў 1921 г. у сваёй прамове аб канцэсіях. Калі да гэтага часу Амэрыка грабіла многія краі, прыкрываючыся лёзунгамі свабоды мораў, політыкі адчыненых дзьвярэй і г. д., то цяпер яна становіцца з году ў год найбольш агрэсыўнай дзяржавай ў змаганьні за новы перадзел сьвету. Змаганьне за сусьветную гегемонію паміж Паўночнымі Амэрыканскімі Злучанымі Штатамі і Вялікабрытаніяй абастраецца цяпер усюды. Гэта змаганьне знайшло сваё яркае адлюстраваньне і на Лёнданскай канфэрэнцыі, што нядаўна адбывалася. Макдональд сабраў Лёнданскую канфэрэнцыю для таго, каб апраўдацца перад рабочымі. Як вядома, урэгуляваньне адносін з Амэрыкай было адным з пунктаў выбарчай праграмы Рабочай Партыі. Мы прадракалі, што Лёнданская канфэрэнцыя зьявіцца крыніцай далейшага абастраньня супярэчнасьцяй. Мы прадбачылі, што ў Лёндане толькі ўзмоцняцца пазіцыі амэрыканскага імпэрыялізму.

І калі гістарычна прасачыць разьвіцьцё амэрыканскага і ангельскага імпэрыялізму, то мы можам бачыць як з году ў год, цэнтр сусьветнай палітыкі перасуваецца з Вялікабрытаніі ў Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты, як разам з гэтым адбываецца перасуваньне і ваеннай магутнасьці ў бок Амэрыкі. Політыка Брытанскай імпэрыі, якая некалі зводзілася да таго, што ангельскі флёт павінен быць роўным двум злучаным флётам іншых імпэрыялістычных дзяржаў, гэта політыка, якая характэрызавала сабою ўвесь пэрыяд даваеннага разьвіцьця, пацярпела ўжо паражэньне. Яшчэ ў 1921 г. зараз-жа пасьля вайны ў Вашынгтоне Англія павінна была прызнаць нявыгодны для яе парытэт у буйных лінейных суднах. Мала таго, у Вашынгтоне быў нанесены Амэрыкай і другі ўдар ангельскай морскай магутнасьці. Прынцып парытэту мог быць параліжаваны Англіяй праз заключэньне саюзу з Японіяй, каб злучаны флёт абедзьвюх дзяржаў быў мацней за амэрыканскі флёт. Але і ў гэтым пытаньні Амэрыка дабілася ў Вашынгтоне паражэньня Англіі, настаяўшы на разрыве морскага саюзу Англіі з Японіяй.

Уся амэрыканская палітыка зводзілася ў гэты пэрыял да таго, каб, з аднаго боку, дабіцца парытэту, а з другога—разьбіць саюз Англіі з Японіяй. Англія прабавала яшчэ супраціўляцца амэрыканскаму імпэрыялізму на знамянітай Жэнэўскай канфэрэнцыі, якая адбылася год таму назад. Але цяпер бясспрэчна, што амэрыканскі імпэрыялізм вышаў пераможцам са спрэчкі на Лёнданскай канфэрэнцыі. Супярэчнасьці паміж Англіяй і Амэрыкай яшчэ мацней абастрыліся. Лёнданская канфэрэнцыя нясумненна зьяўляецца крокам да новай найвялікшай вайны, якой не пераражываў яшчэ капіталістычны сьвет.

Мы бачым, таварышы, што ўзьнікненьне і разьвіцьцё сусьветнага крызісу, падштоўшае за сабой далейшае абастраньне імпэрыялістычных супярэчнасьцяй, пацьвердзіла правільнасьць рэзалюцыі XV Партзьезду, пацьвердзіла цалкам нашу правату ў спрэчках з прымірэнцамі і правымі ў пытаньні аб капіталістычнай стабілізацыі, апраўдалі рашэньні Прэзыдыуму Выканкому Камінтэрну, прынятыя ў поўнай згодзе з позіцыяй Цэнтральнага Камітэту.

Абастраньне зьнешніх супярэчнасьцяй імпэрыялізму знаходзіць сваё выражэньне і ў памацненьні мытнай вайны паміж капіталістычнымі краямі. Усюды назіраецца тэндэнцыя да навышэньня мытных ставак, да закрыцьця граніц, якая надзвычай памацняецца пад уплывам сусьветнага крызісу. Урад Брюнінга ў Гэрманіі павышае тарыфы на цэлы рад прадуктаў больш чым на 500 проц. Уводзяцца павышаныя тарыфы на сельскагаспадарчыя прадукты. Мы бачым, як соцыял-дэмократы, выступаўшыя да вайны за прынцып свабоднага гандлю, капітулююць і ў гэтым пытаньні цяпер перад буйнымі аграрыямі. Мытная політыка протэкцыянізму становіцца ў Англіі ня толькі політыкай консэрватараў. Мы бачым, што гэтую політыку пачынаюць падтрымліваць і лібэралы, і рад членаў з Рабочай Партыі. Няма цяпер ніводнага краю, не ахопленага мытнай вайной.

Вось таварышы, яшчэ адзін з вынікаў сусьветнага крызісу, які падрыхтоўвае новы канфлікт, што насьпявае паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі. Не гадаючы аб тэрмінах сусьветнай вайны, умацоўваючы ў сябе пазыцыі пролетарскай дыктатуры, узмацняючы штогадзіны абароназдольнасьць пролетарскай дзяржавы, мы ўпэўнена глядзім на тое, як ход гістарычнага разьвіцьця капіталізму працуе на нас, падгатаўляючы сілы міжнароднага пралетарыяту для змаганьня за сваё вызваленьне, для змаганьня супроць вайны, для змаганьня за абярненьне вайны імпэрыялістычнай у вынадку, калі яна разразіцца, у вайну грамадзянскую.

3. Капіталістычны сьвет і СССР

Але, таварышы, асноўная супярэчнасьць на цяперашняй сусьветнай арэне, гэта нясумненна супярэчнасьць паміж сьветам будуючагася сацыялізму і сьветам капіталізму. Што новага паявілася у гэтым абсягу ў апошні час у сувязі з нашым пяцігадовым планам? Супярэчнасьць паміж СССР і капіталістычным сьветам выплывае перш за ўсё з пазыцыі двух розных сыстэм, з розьніцы гаспадарчага і політычнага укладу ў абодных лярах. Але, калі ў мінулым гэта супярэчнасьць жывілася яшчэ тым, што са сфэры сусьветнай гаспадаркі выпаў вялікі рускі рынак, то цяпер паявіўся новы фактар, які паглыбляе прорву паміж Савецкім Саюзам і капіталістычным сьветам. Гэта факт выкананьня намі пяцігадовага пляну.

Капіталістычны сьвет прадбачыць выступленьне Савецкага Саюзу ў бліжэйшыя гады, як магутнай экспартнай дзяржавы, якая будзе біць капіталізм у смаых слабых яго вывёнах, у пытаньні аб рынках. Калі здань камунізму да гэтага часу брадзіла ў відзе нашых камуністычных партый па Эўропе, то цяпер яна маячыць яшчэ перад задыхаючымся ў абцугох крызісу сусьветным капіталізмам у відзе савецкага тавару.

Капіталістычны сьвет гэтую небясьпеку, таварышы, улічвае. Праўда, тут не абыходзіцца без шантажу з боку капіталістаў. Даволі сказаць, што напрыклад, з год таму назад, калі мы выкінулі на рынак яких-небудзь 30 тысяч тон збожжа, увесь ангельскі і канадзкі буржуазны друк падняў шалёнае выцьцё з поваду таго, што становішча канадзкіх фэрмэраў зьяўляецца цяжкім ў сувязі з гэтым вывазам 30 тысяч тон збожжа. Сусьветны капітал прабуе біць на нашым імпартна-экспартным пляне. Ён ставіць сабе задачу сарваць што-б там ні сталася наш імпартна - экспартны плян. І за апошнія месяцы мы бачым, як сыстэматычна, упарта, з краю ў край праводзіцца кампанія зрыву нашага экспарту. Вазьмеце вы, напрыклад, змаганьне за рускую запалку: вы ведаеце, якую ролю адыграў у гэтым змаганьні «Крыгер-концэрн», які паступова выціскае нашу запалку ня толькі з Гэрманіі на падставе пагадненьня, што адбылося каля году таму назад з соцыял-дэмократычным урадам, ён выціскае яе з рынкаў Бліжэйшага Усходу.

Калі вы возьмеце любы від экспартнага тавару, вы ўбачыце, што ўсюды капіталізм прабуе павесьці супроць яго вайну. Гэта змаганьне супроць нашага экспарту стварае нам значныя затрудненьні.

Не забывайце, што яшчэ зусім нядаўна мы вымушаны былі абмяжоўваць нашае тэкстыльнае вытворства з-за гэтых спроб сарваць наш экспартна-імпартны плян, пабудзіўшы нас скараніць увоз бавоўны.

Паміма гэтых эканамічных мер змагань ня з намі, супроць нас пускаюцца ў ход і іншыя сродкі. Мы мелі справу ня толькі са спробай стварэньня фінансавай блёкады і абмежаваньня крэдытаў. Супроць нас усе сродкі добрыя. Усе вы памятаеце працэс фальшываманэтчыкаў у Бэрліне, працэс Савелія Літвінава ў Парыжы. Судовымі прыгаворамі ва ўсіх гэтых працэсах сусьветны капітал устанаўляе новы ўстой сваёй моралі: у змаганьні супроць Савецкага Саюзу і падробка вэксалёў, і фабрыкацыя фальшывых грошай зьяўляюцца зусім дапушчальнымі і законнымі сродкамі. Усе гэтыя мерапрыемствы характарызуюць надзвычайнае абастраньне змаганьня сусьветнага капіталу супроць СССР і абумоўліваюць рад нашых затрудненьняў.

І калі, таварышы, у гэтых умовах лютага наступленьня сусьветнага капіталу на нас, наш Цэнтральны Камітэт, ня гледзячы на палічныя крыкі, што чуліся з розных бакоў, ня гледзячы па ўсякія прапазыцыі аб абмежаваньні манаполіі зьнешняга гандлю, дабіліся таго, што мы ўтрымалі нашы пазыцыі на зьнешнім рынку і ажыцьцяўляем наш экспартна-імпартны плян, то гэта ёсьць адно з самых сур'ёзных дасягненьняў нашага Цэнтральнага Камітэту. Вяз усякага нэрваньня, у самых трудных умовах мы выконваем наш плян.

Мы мелі ў гэтыя гады і непасрэдны конфлікт з капіталістычным сьветам. Нядаўна нам прышлося адбіваць націск на Ўсходня-Кітайскай чыгунцы. Я падробна ня буду спыняцца на гэтым пытаньні, гэтыя падзеі яшчэ сьвежы ў нашай памяці.

Вы памятаеце тое выцьцё, якое падняў тады сусьветны капіталістычны друк аб рускім імпэрыялізьме. Яму ўторыла міжнародная соцыял-дэмократыя. Зграя пана Троцкага таксама залямантавала аб тым, што мы праводзім імпэрыялістычную палітыку. Але нам Цэнтральны Камітэт праводзіў цьвёрдую палітыку, ён увесь час падтрымліваў палітыку міру, але ён рабіў гэта апіраючыся на баяздольнасьць нашай Чырвонай арміі, якая сталла зоркім вартаўніком на нашых граніцах. Дужыя ад падтрыманьня міжнароднай рабочай клясы, апіраючыся на давер'е да нашай палітыкі міру найшырэйшых мас, мабілізуючы актыўнасьць і рэвалюцыйны энтузіязм працоўных нашага краю, мы ліквідавалі пагражаючае становішча на Далёкім Усходзе. Наша палітыка ўзяла верх. Мы дабіліся становучых рэзультатаў, дзякуючы нашай цьвёрдай палітыцы.

Якавы нашы далейшыя задачы ў абсягу міжнароднай палітыкі і нашых узаемаадносін з капіталістычнымі дзяржавамі? Узмацняць што-б там ні сталася сілу нашай Чырвонай арміі—гэта першая асноўная задача, якую мы павінны і ў далейшым выканаць. Другая задача — умацаваць што-б там ні сталася монополію зьнешняга гандлю, змагацца за ажыцьцяўленьне нашага экспартна-імпартнага пляну з той жа цьвёрдасьцю, якая была праяўлена і раней нашым Цэнтральным Камітэтам. Трэ-ця задача зводзіцца да таго, каб вызваліцца ў абсягу нашага машынабудаўніцтва, вытворства сродкаў вытворства ад залежнасьці капіталістычных краёў, каб разгарнуць у бліжайшыя гады такое магутнае машынабудаўніцтва, якое далкам выбавіла-б нас ад гэтай залежнасьці. Нарэшце, чацьвертая наша задача, непарыўна зьвязаная з першай задачай, зводзіцца да таго, каб узмацняць нашу політыку міру з той жа настойлівасьцю, упэўненасьцю ў сваіх сілах, самаўладаньнем, як мы гэта праводзілі да гэтага часу.

4. Рэвалюцыйны ўздым

Я пераходжу да пытаньня аб сусьветным рэвалюцыйным руху і аб Камінтэрне. Мы маем у апошні час ня толькі абастрэньне зьнешніх супярэчнасьцяй капіталізму, але, што асабліва важна, абастраньне на аснове разьвіваючагася крызісу ўсіх унутраных супярэчнасьцяй капіталізму. Ужо ў перыяд XV партыйнага зьезду мы канстатавалі гэта няўхнённае абастраньне, якое навін на было вырасьці ў рэзультаце капіталістычнай рацыяналізацыі. Капіталістычная рацыяналізацыя ляпла цяжкім камэнем на плечы рабочай клясы, яна павысіла эксплётацыю рабочых, яна скарацила чарабтную плату, яна у той жа самы час стварыла вагромністую рэзэрвовую армію працы, выціснуўшы цэлыя пласты пролетарыяту з вытворчага процэсу. Капіталістычная рацыяналізацыя зьявілася асновай паляпшэньня рабочай клясы. Што прыбавілася з таго часу? Да гэтых асноўных момантаў прыбавіўся новы момант — сусьветны крызіс, нябачаны рост безрабоцьця. У сувязі з гэтым, у сувязі з капіталістычнай рацыяналізацыяй, у сувязі з сусьветным руху адбываецца цэлы рад перагрупавак. Цяперашні рэфармізм і цяперашняя соцыял-дэмократыя, гэта не стары рэфармізм, не старая даваенная соцыял-дэмократыя. Мы бачым, што старая соцыял-дэмократыя і ранейшая рабочая арыстакратыя зьмяніліся цяпер. Капіталістычная рацыяналізацыя дэкваліфікавала цэлыя пласты рабочай арыстакратыі і стварыла многалікія камандныя пласты майстроў, тэхнікаў, тэхнічны персонал. Такаво зьмяненьне соцыяльнай базы соцыял-дэмократыі. У той-жа час соцыял-дэмократыя пашырыла сваю базу за кошт дробна-буржуазных пластоў. І калі соцыял-дэмократы гаворыць аб тым, што яны заваёўваюць цяпер тыя пласты, якія ішлі за фашызмам, дык гэта азначае нішто іншае, як тое, што соцыял-дэмократыя, апіраючыся на новыя пласты, сама фашызуецца.

Калі мы паставілі пытаньне аб гэтай фашызацыі соцыял-демократаў, Брандлер і компанія закрычалі аб тым, што гэта ёсьць у істоце політыка лянкі, сваркі, што трэба даць сур'ёзны аналіз стану соцыял-дэмократыі.

Дазвольце прывесьці адну цытату, якая пакажа вам, ці сапраўды соцыял-дэмократы зьяўляюцца партыяй, якая змагаецца, як думаюць правыя, за рэформу, ці гэта партыя пражэтлага соцыялфашызму. Я маю на ўвазе вядомага правадыра італьянскага рэфармізму перайшоўшага да фашыстаў, Дэрагону. Вось што ён піша аб праграме соцыял-фашызму:

«Сярод пролетарыяту заходніх краёў пранікла перакананьне, што ў цяперашні час ня трэба васьці клясавага змаганьня, каб дабіцца некаторых выгад. Рэволюцыйная забастоўка зусім выгнана з праграм. Мы чуем зусім ясную прымету гэтай зьмены ідэалёгічнай установкі. У Гэрманіі гэта выражаецца ў разьвіцьці рабочых судоў, у перанясеньні вырашэньня буйных канфліктаў у ар

XIII зьезд кампартыі (бальшавікоў) Беларусі

Ад XV-да XVI зьезду УсеКП(б)

Даклад Д. З. Мануільскага

(Пачатак глядзі на 1-й стар.)

Гэта значыць, што ў сувязі з задачай пераводу буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў фазу пролетарскай рэвалюцыі, перад кітайскай рэвалюцыяй стаіць пытаньне ўжо аб тым, якія задачы ставіць цяпер перад саветамі, устае пытаньне аб тым, якія формы зямляўладаньня ўжываць цяпер у Кітаі; якія прадпрыемствы павінны быць нацыяналізаваны і г. д.

Мы маем цяпер у Кітаі падзеі выключна вялікага значэньня, якія сьведчаць аб тым, што кітайская рэвалюцыя не памерла, што яна ўступае ў паласу новага пад'ёму. Перад Комінтэрнам і кітайскай кампартыяй стаіць задача далейшага разьвіцьця рэвалюцыйнага змаганьня ў Кітаі, узмацненьня атрадаў кітайскай чырвонай армії, захвату буйных прамысловых цэнтраў для ўмацаваньня гегемоніі пролетарыяту ў разьвіваючымся рэвалюцыйным руху Кітаю.

Вы бачыце, што і тут пацьверджана самым жыцьцём правільнасьць ленінскай лініі нашай партыі, якую нам прыходзілася ў свой час адстаіваць у спрэчках з Троцкім і яго таварышамі прыхільнікамі.

Вы ўсе, таварышы, ведаеце з газэт, што мы маем цяпер рост рэвалюцыйнага змаганьня ў буйнейшай ва ўсім сьвеце колёніі, у Індыі. Змаганьне супроць дваларства ангельскага імперыялізму ў Індыі выліваецца ў формы паўстаньняў у Шанапуры, у адным з тэкстыльных цэнтраў Бомбэйскай провінцыі у Пешавары, радне, сумежным з Аўганістанам. Масы, якія паўстаюць, апіраюцца ў сваім змаганьні супроць ангельскага імперыялізму на цэлы рад плямён., якія да цяперашняга часу не пакораны ангельскім імперыялізмам; гэта асабліва хвалюе цяпер ангельскі ўрад.

Трэба добра ўясьніць сабе, што прадстаўляе сабой гэты рух у Індыі, ці гэта рух, што працякае пад гегемоніяй пролетарыяту, ці гэта пакуль што рух, які вырас на аснове вялікага рабочага руху ў 1929-30 годзе, але знаходзіцца яшчэ пад уплывам індускай буржуазіі

Можна сказаць, што масавы рух бомбэйскіх тэкстыльшчыкаў, якія зьяўляюцца красой і гордасьцю пролетарыяту Індыі, што рух джутавых рабочых у Калькуце, чыгуначнікаў вялікай індыйскай чыгункі, што гэты рух у значнай ступені разварушыў масы і дапамог росту цяперашняй магутнай рэвалюцыйнай хвалі ў Індыі. Тым ня менш мы павінны прызнаць, што рух у Індыі ня ідзе яшчэ пад уплывам пролетарыяту, цяперашні рух працякае яшчэ пад гегемоніяй буржуазіі. Нельга нацыянальную буржуазію ў індыйскай рэвалюцыі раўняць з нацыянальнай буржуазіяй кітайскай рэвалюцыі: роля першай цяпер іншая, чым тая, якую іграла нацыянальная буржуазія ў першую фазу кітайскай рэвалюцыі. Таму проблема індыйскай рэвалюцыі ставіцца цяпер зусім паіншаму. Індыя адрозьніваецца ад Кітаю тым, што Кітай гэта поўколёнія, дзе на першай фазе кітайская буржуазія змагалася супроць чужаземнага імперыялізму. Кітай ня так зросься з ангельскім імперыялізмам, у той час, як Індыя—колёнія Англіі і індыйская буржуазія зраслася з ангельскай, з яе банкамі. прамысловасьцю. У сілу гэтага індыйская нацыянальная буржуазія цясьней зьвязана з ангельскім капіталам. Гандзі, які кіруе цяпер так званым насыўным супраціўленьнем у Індыі, робіць наступную заяву ў друку: «Я ня так баюся віцэ-караля Індыі, як баюся рэвалюцыянэраў з іх гвалтоўнымі мэтодамі змаганьня». Гандзі заклікае цяпер масы да змаганьня і супраціўленьня мэтодамі грамадзянскага непаслушэнства.

Пры гэтых умовах мы павінны добра ўясьніць сабе тое, што індыйскі рэвалюцыйны рух знаходзіцца толькі ў першай фазе свайго разьвіцьця, што перад індускімі комуністамі стаіць цяпер асноўная задача змагацца за гегемонію пролетарыяту ў рэвалюцыйным руху Індыі, змагацца за разьвіцьцё там самастойнага рэвалюцыйнага рабочага руху. І мы назіраем ужо сымптоматычныя прыметы таго, што гэта лінія, ня гледзячы на адсутнасьць сур'ёзнай арганізаванай комуністычнай партыі ў Індыі, ствараецца інстынктыўна індыйскім пролетарыятам. Калі, напрыклад, некалькі часу таму назад быў арыштаваны Нэру, якія зьяўляецца адным з правадыроў нацыянал-рэформісцкага крыла профсаюзаў, група індыйскіх студэнтаў зараз жа мінулася на прадпрыемствы, прабуючы вывесьці рабочых на абарону Нэру Але рабочыя не крануліся з месца, а вось калі судзілі Міруцкіх вязьняў у Бомбэі, адбылася дэманстрацыя, у якой было чварць мільёнаў ўдзельнікаў і сярод іх вялізная колькасьць рабочых. Гэта сьведчыць аб тым, што індыйскі пролетарыят пачынае ўсьведамляць сабе, як клясу, але яшчэ не ў выстарчальнай ступені. каб узяць на сябе кіраўніцтва індыйскім рэвалюцыйным рухам.

Наступная задача, якая стаіць перад комуністамі ў Індыі, гэта разварушыць сялянскі рух. 60 проц. усёй зямлі ў Індыі знаходзіцца ў руках буйных памешчыкаў-фэўдалаў Мы маем першыя адзнакі разварушэньня сялянства (конфэрэнцыя ў Пэнджабе); ёсьць весткі, што ў радзе провінцый сялянства прыходзіць у рух, але гэта яшчэ толькі першыя парасткі. Асноўная задача індускіх комуністаў заключаецца ў тым, каб разварушыць на рэвалюцыйнае змаганьне іншапляменныя сялянскія масы Індыі.

Трэцяя задача, якая паўстае перад компартыямі перадавых капіталістычных краёў, у сувязі з індыйскай рэвалюцыяй, гэта—разварушэньне эўропэйскай рабочай клясы без дапамогі якой індыйская рэвалюцыя можа пацярпець паражэньне і ў першую чаргу разварушэньне ангельскага пролетарыяту.

Такавы тыя асноўныя задачы, якія ставіць перад комуністычнымі партыямі ўзрастаючая хваля індыйскай рэвалюцыі.

Узмацненьне комуністычных партый, абвастрэньне клясавага змаганьня ва ўсім сьвеце, рост рэвалюцыўнага ўздыму—усё гэта прадыктавала нам неабходнасьць узяць курс на заваяваньне большасьці рабочай клясы. Не істэрычныя крыкі аб тым, што мы ўжо знаходзімся ў фазе непасрэдна-рэвалюцыйнай сытуацыі, а ўпартая доўгачасная, сыстэматычная работа масавых арганізацый, самая ўпартая чарнавая работа ў рэформісцкіх профсаюзах, работа пад стваральнем у радзе краёў чырвоных профсаюзаў,—вось што неабходна для заваяваньня большасьці рабочай клясы. Мы ажыцьцяўлем таксама гэту задачу заваяваньня большасьці рабочай клясы праз стварэньне комітэтаў змаганьня на прадпрыемствах, праз ужываньне тактыкі адзінага фронту. Ці апраўдала сябе гэта лінія? Так. апраўдала, Калі да апошняга часу, у Амэрыцы, з яе агромнай міжнароднай роляй мы мелі слабую колькасна і якасна комуністычную партыю, якая выклікала па дэмонстрацыі ва ўсёй краіне ўсяго некалькі дзесяткаў тысяч чалавек. дык цяпер пры правільна ўзятым курсе на заваяваньне большасьці рабочай клясы. ў той жа Амэрыцы, у апошніх дэмонстрацыях прымала ўдзел у адным Нью-Ёрку 150.000 чалавек. Дзякочыў гэтаму курсу, амэрыканская комуністычная партыя, ня гледзячы на самы цяжкі крызіс, які яна перажыла ў змаганьні з Ловстонам і іншымі правымі элемэнтамі, выправіла сваю лінію, і ўсьпешна ідзе па шляху заваяваньня мас і павялічэньня сваіх кадраў.

Агромнае значэньне для далейшага ўсьпешнага разьвіцьця работы Комінтэрну мелі організаваныя компартыямі міжнародныя аднячасныя выступленьні першага жніўня і 6 сакавіка. На практыцы гэтых выступленьняў мы здолелі правіраваць нашы найбольш слабыя месцы Агромнае значэньне гэтых кампаній заключаецца ў тым, што з іх дапамогаю Комінтэрн выкоўвае інтэрнацыянальную сьвядомасьць рабочых капіталістычных краёў. Усьпех гэтых выступленьняў ёсьць пацьверджэньне правільнасьці лініі Комінтэрна, работа якога [illegible] на сёе[illegible] цесная дапамозе і ўдзеле дэлегацыі ВсеКП(б) у Комінтэрне.

Працяг дакладу т. Мануільскага будзе зьмешчаны ў наступным нумары.

Спрэчкі па дакладу тав. Мануільскага

Прамова тав. Сьцяпанава

Дзякуючы цьвёрдаму кіраўніцтву ЦК, мы маем гіганцкае будаўніцтва ў нашай савецкай краіне. Пытаньне індустрыялізацыі ў нашай краіне падводзіць новую тэхнічную базу пад нашу Чырвоную армію з аднаго боку, і з другога боку — пырокае разгортваньне калгаснага будаўніцтва зараз для нас, для Чырвонай армії высоўвае новыя пытаньні ў рабоце нашай рабоча-сялянскай Чырвонай армії.

Той, хто выступае супроць кіраўніцтва ЦК, забывае асноўнае — ён не разумее, што падчас таго, што ЦК цьвёрда праводзіў у жыцьцё пастановы XV партыйнага зьезду, што ЦК недапусьціў скрыўленьць пастановы XV партзьезду. Таму мы маем усе правы на тое, каб рэзка змушаць усялякія спробы ўхіляцца ад ня на Ленінскі Цэнтральны Камітэт, на кіраўніцтва.

Мы зараз, як ніколі, гаворым аб тым, што наша самая галоўная небяспека— гэта правая небяспека, на якой мы канцэнтруем агонь.

Прамова тав. Скрыпкіна

У нас вельмі кепска стаіць справа з плянаваньнем шляхоў масіц, а гужавымі дарогамі і шасэйнымі. Праз два гады ў нас будуць сотні тысяч аўтамабіляў і мы, з прычыны адсутнасьці дарог, іх ня зможам скарыстаць, як сьлед. Тыя мэханічныя абсталяваньні, якія мы маем у сваёй дзяржаве, мы іх скарыстоўваем па-барбарску. Мы пягавую сілу скарыстоўваем толькі на адну трэць. Трэба сказаць, што плянавальнае ў галіне нашага транспарту зусім нягодная. Мы маем цэлы рад такіх выпадкаў, калі па складзеным пляне праз два-тры месяцы ў лістападзе ёсьць адна пастанова, у сакавіку другая, у красавіку трэцяя. Так працаваць нельга. ЦК нашай партыі на такое зьвяртае ў нашым транспарце павінен зьвярнуць увагу, бо наш транспарт ёсьць асноўны элемэнт, які садзейнічае правільнаму разьвіцьцю народнай гаспадаркі, разьвіцьцю будаўніцтва сацыялізму.

Прамова тав. Нікіфарава

XIII зьезд КП(б)Б павінен будзе даць дырэктыву партыйным арганізацыям па пытаньнях далейшага разгортваньня і замацаваньня калгаснага руху, павінен будзе падкрэсьліць неабходнасьць самай рашучай барацьбы з правым апартуністам як галоўнай небясьпекай на даным этапе, і «левымі» зрібамі асабліва з боку вясковых арганізацый. Бо на месцах яшчэ часамі мы сустракаемся з фактамі, калі асобныя працаўнікі, якія дапусьцілі памылкі пры правядзеньні калектывізацыі, прабуюць рабіць паскокі на партыйнае кіраўніцтва.

Разгортваньне калгаснага будаўніцтва патрабуе адпаведна падрыхтаваных кадраў для будаўнічай работы ў калгасах. Гэта адно з важнейшых пытаньняў у агульнай сыстэме задач калгаснага будаўніцтва. Таму трэба нізавых кіруючых работнікаў вясковых партарганізацый адпаведна перападрыхтаваць. Мне здаецца, было-б мэтазгодным, каб частку вясковых партыйцаў пасылаць хоць на кароткі тэрмін на фабрыкі і заводы.

Гэта дасьць ім паўнае бальшавіцкае загартаваньне і яны потым змогуць лепш кіраваць работай на вёсцы.

Тут, на зьезьдзе, трэба паказаць на тое, што акруговыя зьвеньні капэратыўных арганізацый у асобных галінах работы на калектывізацыі ўнесьлі пейкую блытаніну замест выразнага правядзеньня цьвёрдай бальшавіцкай лініі. Возьмем, напрыклад, справу з кантрактацыяй маладняку рагатай жывёлы. У самы каштоўны пэрыяд сэзону была ўстаноўка на безавансавую кантрактацыю, а калі гэты сэзон прайшоў, калі частку маладняку парэзалі, дык пачалі даваць гроші на кантрактацыю. Гэта недапушчальнае зьвішча, яно нанесла пэўны ўдар па справе разгортваньня жывёлаводзтва.

Нізавы савецкі і кааперацыйны апарат на вёсцы працуюць слабо, таму што ня зусім добра ўкамплектаваны моцнымі кадрамі працаўнікоў. Трэба ўмацаваць адпаведна падрыхтаванымі кадрамі нізавы савецкі апарат.

Прамова тав. Фясюка

У сувязі з ростам тэхнікі нашай Чырвонай армії патрабуецца пісьменасьць байцоў. У гэтых адносінах, ня гледзячы на рад дырэктыў, да нас, у часьці, прыбывае значная праслойка прызыўнікоў няпісьменных. На гэтую [illegible] трэба будзе зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу.

Стан нашай Чырвонай армії, яе куноба не адстаюць ад бурнага росту сацыялістычнага будаўніцтва. Зараз мы на [illegible] кароткага перыяду — 3-х месяцаў у сэнсе баявой падрыхтоўкі робім такія дасягненьні, якія раней набывалі за два гады

Нарэшце, я хачу спыніцца на тым, што памёк чырвонаармейскімі і грамадзкімі арганізацыямі адсутнічае памен вопытам работы.

Ці ведаюць грамадзкія арганізацыі як разгортваецца работа ў нашых чырвонаармейскіх арганізацыях? І наадварот, ці ведаем дакладна мы аб разгортваньні работы ў грамадзкіх арганізацыях?

Мне здаецца, што ў гэтых пытаньнях ёсьць пяўзязка, няма кантакту.

У далейшым трэба перабудаваць работу так, каб партыйныя арганізацыі адналі больш увагі, каб лепш ведалі аб рабоце Рабоча-Сялянскай Чырвонай армії.

Прамова тав. Рашэтнікава

Артыкул тав. Сталіна і прыкладны статут сельска-гаспадарчай арцелі для мясцовых партарганізацый зьявіліся праверкай, наколькі яны працаздольны, наколькі правільна ажыцьцяўлялі пастановы ЦК партыі. З апублікаваньнем артыкулу т. Сталіна мы маглі праверыць, дзе калектывізацыя праводзілася добраахвотна і дзе пры яе правядзеньні скажаліся партыйныя дырэктывы. І там, дзе лінія партыі праводзілася правільна, мы маем моцныя калгасы, якія становяцца ўзорамі калектыўнага гаспадараньня для наўкольных мас беднаты і серадняку, якія яшчэ па-закалгасамі. А там, дзе пры арганізацыі калгасаў скажалася лінія партыі, там калгасы разваліліся.

Нашы нізавыя кааперацыйныя арганізацыі, як паляводсаюз, малжывёлсаюз, крэдытная сыстэма стварылі такую складанасьць у рабоце на мясцох, што калгасьніку для атрыманьня крэдыту, насеньня і г.д. даводзіцца траціць надзвычай шмат часу. Па-мойму трэба абʼяднаць гэтыя арганізацыі і разьмеркаваць асобныя функцыі па аддзелах, каб не ўскладняць работу.

Дрэнна пакуль што пастаўлена справа з культурным абслугоўваньнем калгасаў. У гэтых адносінах Наркамасьветы трэба многае зрабіць, каб падцягнуць гэты слабейшы вучастак нашай работы на вёсцы.

Пры правядзеньні веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі на мясцох мы мелі рад труднасьцяй. Некаторыя плянуючыя органы дапусьцілі рад няўвязак. Вось, напрыклад, у справе вапнаваньня глебы калгасных палёў. Была дана дырэктыва аб заключэньні ўмовы на вапнаваньні ў калгасах. Умовы заключылі, а вапны на месца не даставілі. Так гэтыя ўмовы і засталіся нявыкананымі.

Пры крэдытаваньні калгасаў некаторыя нашы кааперацыйныя арганізацыі замест таго, каб сканцэнтраваць крэдыт у адным найбольш буйным калгасе, распыляюць крэдыты, разьбіваюць яго малымі сумамі для калгасаў. Пры такіх абставінах мы ня маем магчымасьці праводзіць тое ці іншае буйнае гаспадарчае мерапрыемства, напрыклад, будаўніцтва і г. д.

У справе абслугоўваньня калгасаў спэцыялістымі таксама назіраецца распыленасьць, а часамі няправільнае скарыстаньне спэцыялістых у калгасах. Неабходна ўвесьці пастаянную адзінку агранома, каб ён практычна дапамагаў нашым калгасам, каб ён дапамагаў бастрацтву і беднаце будаваць буйныя калгасы.

Пралетарская пераклічка

Проста з заводаў у пачарпелых блюзах мэталістых і чыгуначнікаў, у вапнана-шэрай вопратцы будаўнікоў, рушыліся рабочыя атрады са ўсіх украін гораду на Валаларскую. да Дому Культуры, дзе сабраўся штаб байцоў ленінскай гвардыі—XIII зьезд.

Пралетары гор. Менску прыйшлі сказаць зьезду, што яны з пільнай увагай сочаць за яго работай, што працай за ўдарных брыгадах, ля варштатаў, за машынай, на полі, яны, пад кіраўніцтвам партыі, вырашаюць вялікія задачы сацыялістычнага будаўніцтва, што за сьціной авангарду рабочай клясы — моцная сьціна пралетарскага давер'я і падтрыманьня.

— Ленінская партыя — наша пралетарская партыя, яна моцна нашым давер'ем, яна выконае нашу волю і цянкім сілам ня ўдасца зьбіць яе з вызначанага шляху. Заявіць аб гэтым прыйшла шматтысячная рабочая дэманстрацыя.

А б гадзіне веч. зьявіліся першыя калёны. На працягу 2-х гадзін шматлікімі атрадамі цягнуліся дэманстранты. у сотнях сьцягаў, плякатаў і лёзунгаў вызначалі імы сваё жаданьне, сваю непахісную волю.

Безьліч лёзунгаў, часта выведзеных няўмелай рукой заводзкага мастака-аматара, заклікалі праводзіць і надалей рашучае сацыялістычнае наступленьне, ажыцьцёвіць пяцігодку ў чатыры гады, патрабавала ўдарыць на руках тых, хто перашкаджае сацыялістычнаму наступленьню, хто чапляецца за кола паравозу гісторыі, хто ўпадае ў панику і пасуе перад цяжкасьцямі

Лёзунгі дэманстравалі глыбокае давер'е пралетарыяту да ленінскай партыі і зьявіліся лепшым адказам усім тым, хто страціў веру ў сілы рабочай клясы.

З грузавікоў дэлегаты зьезду горача віталі дэманстрантаў. Лёзунгі вынкутыя імі з энтузіязмам падхапляліся калёнамі, па радох праносілася працяглае «ура», то тут, то там раздаваліся воклічы ў гонар XIII зьезду КП(б)Б, Ленінскага ЦК і правадыра нашай партыі тав. Сталіна. Рабочая кляса пераклікалася са сваім авангардам.

Прайшлі стройныя калёны чыгуначнікаў, за імі рушыліся атрады заводаў «Энэргія», «Камунар», «Бальшавік», прайшлі харчавікі, сельгасрабочыя, доўгай стужкай пацягнуліся пярэнгі рабочых будаўнікоў-сэзоньнікаў.

Скончылася дэманстрацыя прафарганізацый. Чырвоная армія прыйшла віталь зьезд.

Прайшлі дэманстранты... Дэлегацыі рабочых накіраваліся ў залю перадаць зьезду свае імкненьні, сваю волю.

Гэтая воля пераможа. Упартай працай гэраічных будняў рабочыя завяваюць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, а за іх сьціной—Чырвоная армія, якая пільна стаіць на варце краю будуючагася сацыялізму.

Б-ў.

Дзеньнік зьезду

— На раніпнім пасяджэньні ад 3-га чэрвеня з арганізацыйнай справаздачай ЦК КП(б)Б выступіў сакратар ЦК КП(б)Б т. **Я. А. Васілевіч.** Са справаздачай рэвізійнай камісіі ЦК КП(б)Б выступіў т. **Кроль.**

— У спрэчках па дакладу т. т. Гея і Васілевіча на раніпнім пасяджэньні выступалі т. т. **Канавалаў, Зыльбэр, Чэрвякоў і Смаль.**

— У канцы раніпняга пасяджэньня зьезд віталі чырвонаармейскія часьці менскага гарнізону. З прывітальнымі прамовамі выступалі: ад курсантаў **АБВШ т. Буйко,** ад №-най беларускай стралковай дывізіі—**т.Эпштэйн** і ад №-скай кавдывізіі **т. Мзеровіч.**

Для прывітаньня чырвонаармейцаў зьезд вылучыў дэлегацыю у складзе наступных таварышоў: Ягорава, Арапштама, Бэнэка, Сенкевіча, Адамовіча, Чахновіча, Хаталенка, Гурчонка, Кавальчука, Карнейчыка, Бурава, Арапчука, Пятушкова, Рапапорта, Разумава, Пішнёнка.

— **Учора а 5-ай гадзіне ўвечары ў гонар XIII Усебеларускага зьезду КП(б)Б адбылася вялізарная дэманстрацыя рабочых г. Менску і вайсковых часьцей.**

— Пасьля дэманстрацыі зьезд віталі прадстаўнікі рабочых менскіх фабрык і заводаў.

Ад мэталістых г. Менску зьезд вітае т. Бабенка. Тав. Бабенка рапартуе аб дасягненьнях заводу **«Камунар».**—Завод «Камунар» -кажа т Бабенка, вырас, з працакалектыву і с.-г. майстэрань. Вытворчая праграма ў 1927-28 годзе складала 1200 тыс. руб. з агульнай колькасьцю рабочых у 413 чалавек. Вытворчая праграма па 1929-1930 год складае 3117 тыс. руб. з колькасьцю рабочых у 441 чалавек. За 7 месяцаў па выпрацоўцы прадукцыі прамфінплян выкананы на 103,8 проц.

— Наш завод,—кажа далей т. Бабенка, мае зараз тры ўдарныя цэхі, два камуністычных цэхі. Рабочыя такарнага цэху аднагалосна пастанавілі абвясьціць сябе цэхам ударным імя XIII зьезду КП(б)Б.

Тав. Бабенка зачытвае заяву старых рабочых аб уступленьні ў рады КП(б)Б.

— **Ад імя трох з паловай тысяч рабочых-чыгуначнікаў зьезд вітае т. Мехэдка.**

— Чыгуначнікі менскага вузла ўступілі ў сацспаборніцтва. На 1-га чэрвеня ўдарным рухам ахопілена 3615 чыгуначнікаў.

— Але гэта толькі першыя крокі нашага сацыялістычнага спаборніцтва Мы рабочыя-чыгуначнікі на XIII зьезьдзе Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі заяўляем, што наш паравоз, дзе якога семафор быў адкрыты ў Кастрычніцкую рэвалюцыю 1917 году, шпарка ідзе наперад. Сацыялістычнае спаборніцтва, якое кідае новы вугаль у топку нашага цягніка, прымушае яго яшчэ шпарчэй ісьці наперад да «станцыі»—сацыялізм.

— **Ад чыгуначнікаў Асіпавіцкага вузла зьезд вітае т. Хічэўскі.**

— **Ад рабочых-гарбароў-зьезд вітае т. Станчык.**—У першае паўгодзьдзе завод «Бальшавік» меў прарыў у выкананьні прамфінпляну. Рабочыя чырвона-штандартнага заводу «Бальшавік» прыклалі ўсе намаганьні, усю энэргію і, пачынаючы з сакавіка, мы прамфінплян выкапалі з перавышэньнем.

— **Тав. Квіткевіч вітае зьезд ад чыгуначнікаў.**

— Мы, рабочыя-чыгуначнікі, перадаем свой падарунак XIII зьезду КП(б)Б—спэцыяльна адраманТаваны цягнік, 8 таварных вагонаў і тры клясных вагоны. Надыходзячасу XVI зьезду ўсеКП(б) мы рыхтуем у падарунак 10 таварных вагонаў.

— **Ад імя 10.000 с.-г. і лясных рабочых Беларусі зьезд вітае т. Стучынскі.**

— **Ад шкляной гуты імя Камінтэрну Бабруйскай акругі зьезд вітае тав. Янтоўскі.**

— Ад імя 3.000 чыгуначнікаў Аршанскага вузла з прывітаньнем выступіў т. Цярэньцьеў.

Тав. Цярэньцьеў зачытвае рапарт аб рабоце Аршанскага вузла. Ад імя чыгуначнікаў Аршанскага вузла прамоўца запэўніе XIII зьезд у тым, што чыгуначнікі прыкладуць усе сілы да зьніжэньня недахопаў, якія маюць месца на Аршанскім вузле.

— **Ад інжынэраў і тэхнікаў Аршанскага вузла зьезд вітае т. Афонін.**

Дазвольце запэўніць XIII зьезд КП(б)Б, кажа тав. Афонін, што той прарыў, які быў па Аршанішчыне, які быў пырока асьветлены на старонках друку, у сучасны момант ліквідаваны.

— **Ад інжынэраў і тэхнікаў г. Менску зьезд вітаў т. Каплан.**

— **Ад рабочых друкарні імя Сталіна зьезд вітаў наборшчык друкарні т. Гельфанд.**

Вітаючы зьезд, т. Гельфанд расказаў, што друкарня за першае паўгодзьдзе выканала прамфінплян на 103 проц. Друкарня абвясьціла сябе ўдарнай. Мы прыстасоўваем нашу друкарню да таго, каб ленінскім друкаваным словам дапамагчы партыі пабудаваць сацыялізм.

— **Ад рабочых—будаўнікоў ільна прадзільнага камбінату г. Воршы вітаў зьезд т. Ласкін.**

— **Ад Бабруйскага дзвааапрацоўчага камбінату зьезд вітаў т. Бэйла.**

Да XIII зьезду КП(б)Б 120 рабочых камбінату падалі заяву аб уступленьні ў рады камуністычнай партыі.

— **Ад калгасу «Прагрэс», Бабруйскага раёну, зьезд вітаў т. Васіленка.**

— **Ад імя камунараў камуны «Зьвязда», Сьмілавіцкага раёну, з прывітаньнем зьезду выступіў т. Лысок.**

— **Зьезд віталі ад нацыянальнага калгасу Мазьярычыны т. т. Мінеўіч і ад інтэрнацыянальнага калгасу «Сацыялістычны век» т. Курцэн.**

— **Ад імя 25.000. працаўнікоў асьветы,** у тым ліку ад імя навуковых працаўнікоў Беларускай Акадэміі Навук, Беларускага Дзяржаўнага Ўнівэрсытэту, Беларускай С.-Г. Акадэміі і інш. навукова-дасьледчых устаноў Савецкай Беларусі **зьезд вітаў акадэмік т. Вальфсон.**

— З прывітаньнем ад Усебеларускай канфэрэнцыі асьветнікаў і сельскіх настаўнікоў вітаў зьезд т. Васілеўскі.

***

Вячэрняе пасяджэньне зьезду скончылася словам т. **Грысевіча,** які адказаў ад імя зьезду па прывітаньні.

Прамова т. Грысевіча будзе надрукована ў наступным нумары.

Пралетарыят Нямеччыны перайшоў у контр-наступленьне

Крывавыя сутычкі рабочых з фашыстымі

НЯМЕЦКІЯ ПРАЛЕТАРЫ МАСАВА УСТУПАЮЦЬ У КАМПАРТЫЮ

У КОНТР-АТАКУ

БЭРЛІН, 3. У адказ на наступленьне прадпрыемцаў рабочыя мабілізуюць свае сілы для арганізацыі адпору. Учора ў Рурскай вобласьці адбыліся дэманстрацыі, у якіх прынялі ўдзел дзясяткі тысяч рабочых. Дэманстрацыі прайшлі пад лёзунгам падтрыманьня рашэньня канфэрэнцыі рэвалюцыйнай прафапазыцыі, якая гэтымі днямі адбылася ў Эсэне (галоўным горадзе Рурскай вобласьці).

На многіх прадпрыемствах выбухлі забастоўкі. Бастуюць рабочыя буйнога мэтанэргічнага заводу ў Бэрліне, бавўняна-пяняровай фабрыкі ў Крэфэльдзе і інш. Забастоўка рабочых на аднэй з фабрык вайсковага рыштунку ў Бэрліне, якая адбывалася на працягу многіх дзён, скончылася перамогай рабочых. Прадпрыемцы прымушаны былі ня толькі адмовіцца ад спробы зьніжэньня зарплаты на 5 процантаў, але павысіць зарплату.

ЗАЯВІЛІ АБ ПЕРАХОДЗЕ Ў КАМПАРТЫЮ

БЭРЛІН, 3. На раённым зьезьдзе арганізацыі кампартыі ў Ніжняй Саксоніі, цэлы рад сацыял-дэмакратычных дэлегацый заявіў аб сваім пераходзе ў кампартыю. У новы райком увайшлі, галоўным чынам, рабочыя ад варштату, работніцы і прадстаўнікі рабочай моладзі. Аднагалосна быў выключаны кіраўнік прымірэнцаў Гэйер за фракцыйную работу.

***

БЭРЛІН, 3. Усенямецкі камітэт працоўных жанчын, абраны ў 1929 годзе на зьезьдзе ў Бэрліне, прыступіў да падрыхтоўкі II зьезду.

Гэтымі днямі скончыўся рад акруговых канфэрэнцый працоўных жанчын. Канфэрэнцыі гэтыя былі скліканы кампартыяй і рэвалюцыйнай прафапазыцыяй і гавораць аб значных зьменах у мабілізацыі працоўных жанчын. Так, на канфэрэнцыі ў Вупэртале прымала ўдзел 99 дэлегатак ад прадпрыемстваў і масавых пралетарскіх арганізацый.

Акрамя таго, на канфэрэнцыі прысутнічала звыш 100 працоўных жанчын у якасьці гасьцей. Работніцы гаварылі аб жудаснай эксплёатацыі ў выніку капіталістычнай рацыяналізацыі і беспрацоўя. У радзе тэкстыльных фабрык працуюць падросткі маладзей 18 год. На фабрыках штучнага шоўку тэмп работы ўзрос на 200 проц На многіх прадпрыемствах уведзены 72-гадзінны рабочы тыдзень. Усе дэлегаткі падкрэсьлівалі, што рэфармісцкая прафбюракратыя заўсёды дзейнічае разам з прадпрыемцамі супроць рабочых.

Канфэрэнцыя пастанавіла дэлегаваць на V кангрэс Прафінтэрну адну работніцу, якая аднячасова зьявіцца прадстаўніком працоўных жанчын у нямецкай рабочай дэлегацыі, што пасылаецца ў СССР.

На канфэрэнцыі працоўных жанчын у Хэмніцы прымала ўдзел 99 дэлегатак, з якіх 30 дэлегаваны ад фабрык і заводаў. 27-га чэрвеня ў Дзюсэльдорфе склікаецца акруговая канфэрэнцыя працоўных жанчын Ніжняга Рэйну.

***

БЭРЛІН, 3. Агульны лік беспрацоўных мэталюргічнай прамысловасьці ў Нямеччыне перавысіў да канца красавіка 1930 году амаль у два разы лік беспрацоўных у 1927-29 годзе і павялічыўся на 65 проц. у параўнаньні з мінулым годам.

ПАЛІЦЫЯ АБАРАНЯЛА ФАШЫСТЫХ

БЭРЛІН, 3. У Брослаўлі ў часе дэманстрацыі фашысцкага «Сталёвага шлему» адбыліся сутычкі паміж фашыстымі і рэвалюцыйнымі рабочымі, арганізаванымі дэманстрацыю пратэсту. Шмат удзельнікаў сутычкі паранены. Паліцыя, якая абараняла фашыстых, арыштавала 30 рабочых. У Лейпцыгу калёна нацыянал-сацыялістых (фашыстых) напала на камуністых, якія энэргічна адбілі напад, прычым паранены шмат нацыянал-сацыялістых.

ПАД ПРЫКРЫЦЬЦЕМ БРАНЯВІКОЎ

БЭРЛІН, 3. Пад прыкрыцьцем паліцыі і паліцэйскіх бранявікоў нацыянал-сацыялістыка (фашыстыя) правялі ў Плаўэне (Саксонія) зьлёт нацыянал-сацыялістых Сярэдняй Нямеччыны. Рабочыя наладзілі дэманстрацыю пратэсту і прасьледвалі нацыянал-сацыялістых бокамі: «Далоў» і «Рот фронт». Рабочыя загарадзілі адну з вуліц, каб перашкодзіць прасоўваньню фашысцкай дэманстрацыі. Паліцыя расьцісьціла гэту вуліцу, зьбіваючы дубінкамі рабочых, жанчын і дзяцей. Ёсьць шмат параненых. 20 рабочых арыштавана.

ФАШЫСТЫЯ АДКРЫТА ЗАБІВАЮЦЬ РАБОЧЫХ

БЭРЛІН, 3. Выпадкі крывавых нападаў фашыстых на рабочых, якія здараюцца ўсё часьцей, прымусілі нават буржуазны друк патрабаваць ад улады энэргічных мер. Нават лева-буржуазныя газэты напамінаюць, што год таму назад чырвоны саюз франтавікоў быў забаронены па менш сур'ёзных прычынах у той час, як фашысцкія дружыны «законна» забіваюць па вачох улады.

РАБОЧЫЯ ПАДПАЛІ ПАД ЖОРСТКІЯ АТАКІ ПАЛІЦЫІ

БЭРЛІН, 3. У Мэнгэйме орган камуністычнае партыі «Арбэйтэр Цэйтунг», які заклікае рабочых да дэманстрацыі супроць фашысцкага тэрору, быў канфіскаваны. Рабочыя правялі дэманстрацыю пратэсту, у часе якой, яны падпалі пад жорсткія атакі паліцыі. У выніку сутычкі зьбіта многа рабочых, у тым ліку жанчын і, нават, дзяцей. У зьвязку з дэманстрацыяй рабочых супроць нападу фашыстых у Пірмазэнсе паліцыя арыштавала ў працягу апошніх дзён тыдня 220 рабочых. Нацыянал-сацыялісты (фашысты), які забіў двух рабочых, выпушчаны па волю.

РАБОЧАЯ МОЛАДЗЬ—НА БАКУ ПРАФАПАЗЫЦЫІ

БЭРЛІН, 1. Рэвалюцыйная прафапазыцыя Нямеччыны дабілася ў апошні час у Бэрліне і ў правінцыі раду новых значных посьпехаў. У Волінгене 7.000 мэталістых заявілі аб сваёй гатоўнасьці змагацца пад кіраўніцтвам рэвалюцыйнай прафапазыцыі. Мэталістыя пацьвярджаюць сваё давер'е апазыцыйнаму праўленьню мясцовага саюзу мэталістых, выключанаму рэфармісцкімі прафбюракратамі. У сувязі з мабілізацыяй бэрлінскіх мэталістых на барацьбу за павышэньне заработнай платы і ўдзеньне 7-гадзіннага рабочага дня, рабочая моладзь Бэрлінскіх буйных заводаў «Вэрман унд Флёр» і заводу ўсеагульнай электрычнай кампаніі на вуліцы Блюмэнштрасэ калектыўна далучылася да рэвалюцыйнай прафапазыцыі.

НА ПАДСТАВЕ ПАКАЗАНЬНЯЎ ПРАВАКАТАРА І ШПІКА

БЭРЛІН, 3. Пачаўся працэс 8 членаў антыфашысцкай гвардыі моладзі, якіх абвінавачваюць у забойстве кандуктара Хэсэ. Пракурор патрабуе для абвінавачаных у агульнай складанасьці 26 год катаржнай турмы і 1½ гады турэмнага зьняволеньня. Увесь працэс пабудаваны на фальшывых паказаньнях двох падсудных, з якіх адзін — правакатар, падасланы фашыстымі, а другі, як паведамляе камуністычны друк, — паліцэйскі шпік.

ЗА САЛОМІНКУ ШПІЯНАЖУ

БЭРЛІН, 3. Орган нямецкай кампартыі «Рур Эко», які выходзіць у Эсэне, паведамляе, што прускае міністэрства ўнутраных спраў, па чале якога стаіць сацыял-дэмакрат, даў інструкцыю ўсім начальнікам паліцыі правесьці шпіёнаў у кампартыю і напрабаваць падкупіць службовых асоб партыі з тым, каб выкарыстаць іх у якасьці шпіёнаў.

У радзе рурскіх гарадоў упоўнаважаныя палітычнай паліцыі прапанавалі значныя сумы грошай урадавым асобам кампартыі з мэтаю схіліць іх узяць на сябе роль шпіёнаў. Гэтыя спробы пацярпелі крушэньне. Аднячасова былі спробы сх

Усесаюзны абмен практыкаю барацьбы за лінію партыі

ЛЕПШЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ, КАЛГАСЫ І САЎГАСЫ, ВЫХОДЗЬЦЕ НА ЎСЕСАЮЗНУЮ ПЕРАКЛІЧКУ, НА ДЭМАНСТРАЦЫЮ ВОПЫТУ І ПРАКТЫКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

„Рабочыя лепшых з лепшых прадпрыемстваў, капалень і транспарту Масквы, Ленінграду, Урала, Украіны, Паўночнага Каўказу, АССР, Беларускай рэспублікі і інш, буйнейшых прамысловых цэнтраў павінны даць XVI-му Ўсесаюзнаму зьезду партыі калектыўную справаздачу аб сваёй баявой рабоце, аб сваім вопыце, дасягненьнях і недахопах, якія перашкаджаюць перавыкананьню прамфінпляну".

(З адозвы рабочых „Динамо".

Выклік прыняты

Рабочыя мэханічнага цэху заводу „Энэргія" прынялі выклік рабочых кацельнага цэху на выкананьне вытворчай праграмы да XVI партзьезду на 105 проц. Вылучана група рабочых для распрацоўкі дагавору.

Адначасова вылучана брыгада з 7 лепшых ударнікаў—старых рабочых для барацьбы са стратамі.

Брыгадзіры „Зьвязды": Брайнін і Палічанскі.

Рапарт рабочых і работніц швэйных фабрык Віцебску

2.200 рабочых і работніц віцебскіх швэйных фабрык «Прафінтэрн» шлюць сваё пралетарскае прывітаньне XIII зьезду КП(б)Б.

За першыя 5 месяцаў бягучага гаспадарчага году наша фабрыка мела прадыў на фронце выкананьня вытворчай праграмы і разгортваньня пралетарскай самакрытыкі.

Дзякуючы папярэджаньню, якое мы атрымалі ад партыйных арганізацый, ад цэнтральнай і мясцовай прэсы, і сыгналам рабкораў газэты «Шэр ун айзн», мы з сакавіка месяца пачалі па-бальшавіцку змагацца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. З гонарам мы рапартуем XIII зьезду КП(б)Б першыя вынікі нашай напружанай работы за ліквідацыю нашых прарываў.

ПРАМФІНПЛЯН ПА ВІЦЕБСКІХ ШВЭЙНЫХ ФАБРЫКАХ ЗА ПРАЙШОЎШЫЯ 8 МЕСЯЦАЎ МЫ ВЫКАНАЛІ НА 100,6 проц. САБЕКОШТ ПРАДУКЦЫІ ЗНІЖАН НА 7 проц. ЗАМЕСТ ПАКАЗАНЫХ ПРАМФІНПЛЯНАМ 6,5 проц. МЫ НАЛІЧВАЕМ НА НАШЫХ ФАБРЫКАХ 1.700 УДАРНІКАЎ, МЫ АРГАНІЗАВАЛІ ДЗЬВЕ ДАРНЫЯ БРЫГАДЫ Ў ЦЭХАХ—АДУ ІМЯ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б ПА БАРАЦЬБЕ ЗА ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ І ІРУГУЮ ІМЯ XVI ЗЬЕЗДУ ЎсеКП(б) ПА БАРАЦЬБЕ СА СТРАТАМІ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ.

Арганізоўваюцца новыя вытворчыя аміны імя партыйных зьездаў. Мы ступаем у сацспаборніцтва з Віцебскім узлом МББ чыгункі на лепшае правяденьне інтэрнацыянальнага выхаваньня сярод рабочых, барацьбы з шавінізмам, антысэмітызмам, нацыянал-дэмаратызмам.

МЫ ЎЦЯГНУЛІ Ў ПАРТЫЮ ЗА АПОШНІЯ 4 МЕСЯЦЫ БОЛЬШ 200 РАБОЧЫХ, у большасьці з вялікім рабочым стажам.

Мы падрыхтоўваем кадры кваліфікаваных рабочых і тэхнічнага пэрсаналу для новай фабрыкі.

З бальшавіцкай настойлівасьцю мы змагаемся і мабілізуем актыўнасьць рабочых мас на барацьбу супроць усякіх спроб зацiску самакрытыкі і цкаваньня абкораў.

ЗА АПОШНІЯ ДВА МЕСЯЦЫ ПАСТУПІЛА 118 ПРАПАНОЎ РАБОЧЫХ, якіх ажыцьцяўлена 62. ГЭТЫЯ ПРАПАНОВЫ ДАЮЦЬ НАМ ЭКАНОМІІ 3.600 РУБ. у год. За лепшыя прапановы добрых ударнікаў мы прэміявалі на суму 8 тыс. руб.

АГУЛЬНЫ СХОД РАБОЧЫХ ПРОСІЦЬ ЗЬЕЗД ДАЗВОЛІЦЬ НАЗВАЦЬ НОВУЮ ФАБРЫКУ ІМЕМ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б.

Мы ўрачыста запэўніваем XIII зьезд КП(б)Б, што мы напружым усе нашы сілы і энэргію для выкананьня і перавыкананьня якасных паказальнікаў нашага вытворчага пляну.

Няхай жыве XIII зьезд КП(б)Б!

Няхай жыве ЎсеКП(б) і яе ленінскі ЦК!

Прэзыдыум агульнага сходу рабочых швэйных фабрык Віцебску.

Грамадзкі кантроль над пазыкамі слабы

Камісіі садзейнасьці выдаюць дазволы на продаж аблігацый без уважлівых прычын

Нядаўна скончылася праверка работы гарадзкіх камісій садзейнасьці ў радзе округ БССР.

Як працуюць гэтыя камісіі? Як выконваюць яны даручаную ім адказную вельмі важную справу—грамадзкі кантроль над аблігацыямі масавых пазык? Перш-на-перш праверка выявіла, што ў камісій садзейнасьці непрацаздольных, ня ўзмоцнены працаўнікамі, працэ бясплянава; ёсьць камісіі, якія ня даюць лічбаў калектыўнай падпіскі на 3-ю пазыку (Лесбел).

Асабліва трэба адзначыць, што многія камісіі не ўявілі сабе значэньня гамадзкага кантролю над пазыкамі. Яны вельмі лёгкадумна падыйшлі да справы выдачы дазволаў на продаж і закład аблігацый.

Зразумела, лепшая і большая частка рабочых не прадае і не закладвае сваіх пазык бяз вострай патрэбы, але ёсьць і несьвядомыя, якія скарыстоўваюць гэтна падабраны склад членаў камісій садзейнасьці, каб пад розныя повады дабіцца дазволу на продаж аблігацый.

Камісія пры пабудове універсытэцкага гарадка дазволіла рабочаму прадаць аблігацыі на 250 руб. для куплі гарніту- і ботаў.

У 2-м групкоме рабочых - будаўнікоў Ленск) выдан дазвол на продаж аблігацый для аплаты алімэнтаў; у Негарэўскай мытніцы—для пакрыцьця заработнасьці.

Наогул некаторыя камісіі, замест ажыцьцяўленьня грамадзкага кантролю, выконваюць ролю сабезу, выдаючы дазволы без асабліва ўважлівых прычын. Добра працуе камісія садзейнасьці пры менскім хлебазаводзе. Яна ўважліва падыходзіць да разгляду заяў і праводзіць вялікую растлумачальную работу аб значэньні дзяржкрэдыту.

Наогул, за сакавік і красавік месяцы падзытнымі ўстановамі куплена аблігацый масавых пазык індустрыялізацыі на суму каля 325.000 руб.

Асабліва ўзмоцнены продаж аблігацый меў месца на Віцебскай акрузе — больш 100.000 руб.

Вывады напрошваюцца самі сабою. Камісіі садзейнасьці павінны ўзмацніць грамадзкі кантроль над карыстаньнем аблігацыямі.

Камісіі павінны быць узмоцнены адзядомымі і вытрыманымі таварышамі. Кафэсыянальныя арганізацыі павінны больш увагі зьвярнуць на работу камісій садзейнасьці.

А—н і Б—н.

Чэрвеньскую праграму выканаем не пазьней 25-га чэрвеня

Рабочыя магілеўскай рымарна-сядзельнай фабрыкі, па якой да апошняга часу было толькі 74 ударнікаў, усе разам абвясьцілі сябе ўдарнікамі і пастанавілі хадайнічаць — назваць фабрыку імем XIII зьезду КП(б)Б, а лепшы ўдарны сядзельны цэх — імем XVI зьезду ЎсеКП(б). Рабочыя ўзялі на сябе рад абавязкаў і выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва шляхам пераклічкі рымарную фабрыку ў Менску і завод «Зьвязда» ў Магілеве па наступных пунктах: да сканчэньня работы XIII зьезду КП(б)Б і адкрыцьця XVI зьезду ЎсеКП(б) — ліквідаваць усе прарывы і недахопы, уцягнуць усіх рабочых ва ўдарніцтва і ўзьняць іх працу на належную вышыню, выканаць вытворчую праграму за чэрвень не пазьней 25-га чэрвеня, давесьці прамфінплян да кожнага цэху, варштату і рабочага, заключыць сацыялістычнае спаборніцтва з падшэфным калгасам, арганізаваць пасылку падрыхтаваных рабочых у падшэфныя калгасы для прапрацоўкі тэзісаў і папулярызацыі пастаноў XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду ЎсеКП(б), штодзенна растлумачваць пастановы зьезду сярод рабочых фабрыкі, лепшых рабочых ударнікаў перадаць у рады партыі, па працягу 6 месяцаў уцягнуць да 35% жанчын у вытворчасьць і г. д.

40 прапаноў ад рабочых

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПЕРАВЫБАРАЎ ЗАЎКОМУ НА ВІЦЕБСКАЙ ГАРБАРНІ ЦЕСНА ЎВЯЗВАЕЦЦА З ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА ЗЬЕЗДАЎ. АРГАНІЗАВАНА КАМСАМОЛЬСКАЯ ЎДАРНАЯ БРЫГАДА І ВЫТВОРЧАЯ КАМУНА З СТАРЫХ РАБОЧЫХ ІМЯ XVI ПАРТЗЬЕЗДУ. БРЫГАДА І КАМУНА ЎЗЯЛІ НА СЯБЕ РАД КАНКРЭТНЫХ АБАВЯЗКАЎ ПА ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ. ТРЫ СТАРЫЯ РАБОЧЫЯ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ ЖАДАНЬНІ ЎСТУПІЦЬ Ў ПАРТЫЮ, ПАЧАЛІ ПАСТУПАЦЬ ПРАПАНОВЫ АД РАБОЧЫХ А ПАЛЯПШЭНЬНІ ЯКАСЬЦІ ПРАДУКЦЫІ, ЗНІШЧЭНЬНІ БРАКУ, ПАВЯЛІЧЭНЬНІ ВЫПУСКУ ПРАДУКЦЫІ І Г. Д. ТАКІХ ПРАПАНОЎ ЗА АПОШНІЯ ДНІ ПАСТУПІЛА ЗВЫШ 40.

Перавыканаем плян на 10 проц.

На магілеўскай швэйнай фабрыцы 110 рабочых абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду ЎсеКП(б) і арганізавалі па цэхах 7 новых ударных брыгад.

Рабочыя швэйнай фабрыкі далі абяцаньне зьездам ПЕРАВЫКАНАЦЬ ВЫТВОРЧУЮ ПРАГРАМУ НА 10%.

Запісь тав. Сталіна ў Чырвонай кнізе заводу „Динамо"

МАСКВА, (Па тэлефону от наш. кар.).

Рабочыя заводу „Динамо» зьвярнуліся ў „Правду" з просьбай апублікаваць адначасна са сваёй адозвай да рабочых Масквы, Ленінграду, Уралу, Украіны, Беларусі і інш. подлінную запісь у чырвонай кнізе заводу „Динамо", зробленую генэральным сакратаром ЦК УсеКП(б)—тав. Сталіным.

„Запісь гэта, зробленая 7 лістапада 1924 г., пішуць рабочыя „Динамо", мае выключную палітычную вартасьць. Тав. Сталін у сваім пажаданьні ў чырвонай кнізе разгарнуў яшчэ ў 1924 г. праграму шырокага сацыялістычнага наступленьня па ўсіх зьвеньнях нашага будаўніцтва. Будучы апублікаванай упяршыню запісь гэта к маманту XVI парт'зьезду перад тварам усёй партыі і рабочае клясы яшчэ раз пацьвердзіць правільнасьць пасьлядоўнага выразнага непрымірымага бальшавіцкага кіраўніцтва ЦК УсеКП(б) і яго правадыра, цьвёрдага ленінца—тав. Сталіна".

Запісь тав. Сталіна гаворыць:

„Жадаю рабочым „Динамо", як і рабочым усяе Расіі, таго, каб прамысловасьць пайшла ўгару, каб лік пралетараў Расіі ўзьняўся ў бліжэйшы пэрыяд да 20-30 мільёнаў, каб калектыўная гаспадарка на вёсцы расьцьвіла і падпарадкавала сваёй ўплыву прыватную гаспадарку, каб высокая індустрыя і калектыўная гаспадарка ў вёсцы злучылі канчаткова пралетараў фабрык і працаўнікоў зямлі ў адну сацыялістычную армію".

І. Сталін.

7 лістапада 1924 г. Завод «Динамо».

ДА УСІХ ПРАЦОЎНЫХ САВЕЦКАГА САЮЗУ

Адозва рабочых завода „Динамо"

МАСКВА, 3 чэрвеня (па тэлеф. ад наш. кар.).

Адкрыты сход партарганізацыі заводу «Динамо» публікуе ў заўтрашнім (ад 4 чэрвеня) нумары «Правды» ліст да ўсіх працоўных Савецкага Саюзу ў сувязі з падрыхтоўкай да XVI зьезду партыі.

«Таварышы рабочыя, калгасьнікі, працоўныя Савецкага Саюзу! Мы зварачаем да вас сваё слова і патрабуем, каб вы пачулі нас напярэдадні адкрыцьця XVI Усесаюзнага зьезду партыі бальшавікоў. Гэта падзея павінна прыкаваць да сябе ўвагу кожнага рабочага, кожнага калгасьніка, кожнага працоўнага. Голас XVI зьезду павінен быць чуцён на ўсіх прадпрыемствах, ва ўсіх цэхах, агрэгатах, брыгадах, камплексах, варштатах і лавах, ва ўсіх калгасах, саўгасах і вёсках савецкага краю. Гэты магутны голас ужо з выстарчальнай выразнасьцю чуецца ў пастановах партыйных канфэрэнцый Савецкага Саюзу, у масавых прывітаньнях, наказах і пажаданьнях мільёнаў рабочых і калгасьнікаў—ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту нашай партыі, пад кіраўніцтвам якога мы за пэрыяд ад XV да XVI зьезду дабіліся вялічэзных посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве.

Таварышы! Нашы посьпехі бязумоўна вялікія, але значныя яшчэ і труднасьці і перашкоды, якія мы павінны рашуча, пабаявому перамагчы, зламаць пад выпрабаваным кіраўніцтвам ЦК нашай партыі. На прыкладах з жыцьця нашага заводу мы пераканаліся і пераконваемся ў тым, што ідучы па шляху, вызначаным партыяй, мы дab'емся новых посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве, дab'емся канчатковай перамогі камунізму».

Далей, рабочыя «Динамо» падрабязна расказваюць аб сваёй барацьбе за ажыцьцяўленьне шпаркіх тэмпаў індустрыялізацыі, аб сваіх посьпехах і дасягненьнях у выкананьні кантрольных лічбаў другога году пяцігодкі. Дынамаўцы, запісаныя пядаўна (1-га мая) «Правдой» на чырвоную дошку, ня ўтойваюць і сваіх недахопаў: прабелаў самакрытыкі, рэпткі расхлябанасьці і рвацтва, невыстарчальнае зьніжэньне сабекошту і інш.

«Для таго, каб зьнішчыць буйныя недахопы—гавораць далей дынамаўцы—якія ёсьць у нашага заводу, партыйная арганізацыя павінна яшчэ больш намагчы свае сілы, яшчэ шырэй мабілізаваць масы для рашучай барацьбы як з найбольш небясьпечным на даным этапе правым ухілам, так і з «левым» апартунізмам і прымірэнчымі адносінамі да іх. Сыстэматычная прапаганда ў масах пастаноў надыходзячага партыйнага зьезду значна дапаможа выканаць гэтыя задачы. Партыйная арганізацыя абавязваецца шырока папулярызаваць сярод рабочых «Динамо» пастановы XVI зьезду партыі і пачаць ажыцьцяўляць гэтыя пастановы зараз-жа пасьля іх зацьвярджэньня. Тэзісы Цэнтральнага Камітэту партыі да XVI зьезду мы ухваляем цалкам і поўнасьцю і заклікаем усе партыйныя арганізацыі шырока іх абмеркаваць.

Другі год гаспадарчай пяцігодкі падыходзіць да канца. Каб ня толькі выканаць, але і перавыканаць прамфінплян, зьнізіць сабекошт прадукцыі, дабіцца рашучага паляпшэньня яе якасьці, мы заклікаем рабочыя масы Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам партыі, яе выпрабаванага ленінскага ЦК і прафсаюзаў, яшчэ мацней разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва і работу вытворчых нарад.

Новае палажэньне ЎсеЦСПС аб задачах і рабоце гэтых нарад адкрывае новыя найпырэйшыя шляхі рабочым масам да кіраваньня сваёй вытворчасьцю і ўзьнімае аўтарытэт і значэньне ўдарніцтва. Гэта чарговае мерапрыемства партыі і ЎсеЦСПС дапаможа выклікаць новую магутную хвалю творчага энтузіязму сярод шырокіх мас, перамагчы ўсе труднасьці і недахопы, зьнішчыць перашкоды і з гонарам выканаць наш пралетарскі лёзунг ажыцьцяўленьня пяцігодкі ў чатыры гады.

Канчаючы свой ліст, мы зварачаемся да ўсіх пізавых партыйных і прафсаюзных арганізацый і рабочых мас з прапановаю абмеркаваць наш ліст і падзяліцца праз друк практыкай барацьбы за выкананьне генэральнай лініі партыі. Няхай каменскія рабочыя напіраваў вытворчасьці раскажуць пра свае новыя дасягненьні і посьпехі. Рабочыя ленінградзкага мэталёвага заводу імя Сталіна—аб перабудове заводу ва ВТНУ. Рабочыя заводу імя Пятроўскага—аб выніках праверкі сацыялістычнага спаборніцтва і давядзеньня прамфінпляну да варштату, Клімаўскага заводу, Маскоўскай вобласьці, заводу «Возрождение», у Маркштаце (рэспубліка немцаў Паваложжа),—аб арганізацыі кіраваньня вытворчасьцю пановаму, аб пераводзе цэхаў на гаспадарчы разрахунак. Няхай гарнякі чырвонаштандартных капальняў Донбасу раскажуць усім рабочым, што робяць яны, каб утрымаць у сябе чырвоны сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва. Рабочыя лепшых з лепшых прадпрыемстваў, капальняў і транспарту, Масквы, Ленінграду, Урала, Украіны, Паўн. Каўказа, АССР, Беларускай рэспублікі і іншых буйнейшых прамысловых цэнтраў павінны **даць XVI усесаюзнаму зьезду партыі калектыўную справаздачу аб сваёй баявой рабоце, аб сваёй практыцы, дасягненьнях і недахопах, якія перашкаджаюць перавыкананьню прамфінпляну.**

Мясцовы друк, а таксама фабрычна-заводзкі друк павінны дапамагчы рабочым усіх лепшых з лепшых прадпрыемстваў вывяць сваю практыку і падзяліцца ім праз «Правду» з рабочымі калектывамі, якія адстаюць.

Пралетары Савецкага Саюзу! Мы, дынамаўцы, клічам вас на ўсесаюзную пераклічку, на ўсесаюзны абмен практыкаю змаганьня за генэральную лінію партыі.

З такім-жа заклікам мы зварачаемся да таварышоў калгасьнікаў і рабочых саўгасаў.

Няхай таварышы з калгасу «Ленинский путь» раскажуць пра тое, як яны выканалі ўзятыя на сябе абавязацельствы па перавыкананьні пляну сяўбы, як яны рыхтуюцца да ўборкі ўраджаю, хлебазагатовак і асеньняй сяўбы. Калгасьнікаў з камуны імя т. Сталіна, Пугачоўскае округі, мы просім рапартаваць зьезду аб тым, як арганізавана самадзейнасьць камунараў ў рабоце вытворчых нарад, як гадуюцца імі новыя кадры, здольныя кіраваць калгасным будаўніцтвам. Калгасьнікі імя «Поволожской Правды», якія перавысілі ў рэзультаце спаборніцтва плян сяўбы на 140 проц., раскажэце, як гэта спаборніцтва вы арганізавалі і якім шляхам дабіліся ўцягненьня ва ўдарніцтва калгасьнікаў. Камуну «Украінскі гігант» на Мэлітопальшчыне, Лібэнтальскі калгас, рэспублікі Немцаў Паваложжа, камуны «Перекличка», Донскае округі, і «Новое поле» мы просім падзяліцца сваёю практыкаю арганізацыі працы, расказаць зьезду і ўсім працоўным, як скарыстоўваюцца ў іх гаспадарчая практыка і ініцыятыва серадняка, як серадняк прыцягваецца да кіраўніцтва гаспадарчым жыцьцём у калгасе, як яны дапамагалі ў веснавой сяўбе індывідуальным гаспадаркам. Няхай лепшыя калгасы раскажуць Савецкаму Саюзу аб практыцы сваёй барацьбы з кулацтвам, аб выхаваньні калгасьнікаў у калектывістычным духу і аб тым, як павышаецца пачуцьцё адказнасьці і пагарды сваімі асабістымі інтарэсамі дзеля інтарэсаў агульнакалгасных і агульнадзяржаўных. І, нарэшце, рабочыя Сальскага саўгасу «Гігант» і Барнічоўскага саўгасу (Сібір) і калгасьнікі калектыву імя тав. Сталіна, Донскае акр., перадайце сваю практыку работы партыйных калектываў.

Лепшыя прадпрыемствы, калгасы і саўгасы, выходзьце на ўсесаюзную пераклічку, на дэманстрацыю праз друк свайго вопыту і практыкі сацыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве адзіны, самкнуты пралетарскі фронт змаганьня за генэральную лінію партыі! Гарачае пралетарскае прывітаньне дынамаўцаў ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту і яго кіраўніку—стойкаму бальшавіку т. Сталіну! Мы абяцаем поўнае падтрыманьне партыі і яе ЦК у рашучым змаганьні як з найбольш небясьпечным на даным этапе правым ухілам, так і з «левым» апартунізмам і прымірэнцтвам да яго».

Пасылаюць брыгадзіраў у вёску

На Віцебскай швэйнай фабрыцы «Прафінтэрн» ужо прыступлена да абгаварэньня тэзісаў да XVI партзьезду. Гэтымі днямі выходзіць спэцыяльны нумар заводзкай газэты з матар'ямі аб падрыхтоўцы да зьезду. Для дапамогі падшэфнаму сельсавету ў падрыхтоўцы да зьезду фабрыка пасылае двух брыгадзіраў. Агульны сход рабочых зьвярнуўся з просьбай да АПБ правесьці ў кватэры рабочых трансьляцыйныя пункты радыё-сеткі, што дасьць магчымасьць азнаёміцца з работай зьезду.

Скончыць будаўніцтва раней вызначаных тэрмінаў

Рабочыя, інжынэрна-тэхнічны пэрсанал і служачыя ў колькасьці 2.000 чал., якія заняты на будаўніцтве новых прадпрыемстваў у Магілеве, абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя XIII зьезду КП(б)Б і ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязкаў, у прыватнасьці СКОНЧЫЦЬ БУДАЎНІЦТВА РАНЕЙ ВЫЗНАЧАНЫХ ТЭРМІНАЎ.

ВЕЙША.

Абавязацельствы рабочых саўгасу

У САЎГАСЕ «ВЕЙША», ЯКІ СКОНЧЫЎ СЯЎБУ 13 МАЯ, УДАРНАЯ БРЫГАДА ПАСТАНАВІЛА НАЗВАЦЬ СЯБЕ ІМЕМ XIII ЗЬЕЗДУ, РАБОЧЫЯ ЎЗЯЛІ НА СЯБЕ АБАВЯЗАК ПРАВОДЗІЦЬ ДАЛЕЙШЫЯ ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ ВЫКЛЮЧНА ЎДАРНЫМІ ТЭМПАМІ. ЗАРАЗ РАБОЧЫЯ САЎГАСУ ПАЧАЛІ ПРАПРАЦОЎКУ ТЭЗІСАЎ ДА XVI ЗЬЕЗДУ ЎсеКП(б).

Пераходны сьцяг імя XVI партзьезду

Сход рабочых віцебскай фабрыкі «Дзьвіна» вылучыў делегацыю з ударнікаў, ударных брыгад імя XIII і XVI партыйных зьездаў, якой даручыў вітаць XIII зьезд КП(б)Б і запэўніць яго, што **«Чырвоная Дзьвіна» ліквідуе свой прарыў і перавыканае прамфінплян.**

У фабком і цэхпрафбюро за апошні час паступіла шмат калектыўных заяў ад рабочых, якія абвяшчаюць сябе ўдарнымі брыгадамі імя XIII і XVI партзьездаў. Рамонтны, дрэваапрацоўчы, затэрны, істужкавы, часальны і матальны цэхі абвясьцілі сябе ўдарнымі. Усе цэхі ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы. Істужкавы цэх, які атрымаў сьцяг за лепшае сацспаборніцтва, назваў гэты сьцяг **імем XVI партзьезду.** Фабрычная «культзмычка» пасылае спэцыяльную брыгаду на вёску для прапрацоўкі тэзісаў да XVI партзьезду.

МАГІЛЕЎ, 3-VI (па тэлефону ад нашага кар.). Учора рабочыя і работніцы Магілеўскай цукерні на агульным сходзе пастанавілі стварыць пераходны сьцяг імя XVI партзьезду для ўзнагароды ім лепшага прадпрыемства. Рабочыя зьвярнуліся ў рэдакцыю «Камунара Магілеўшчыны» ўзяць на сябе ініцыятыву па арганізацыі гэтага пераходнага сьцягу.

Да XVI зьезду УсеКП(б) — поян да варштату

Тэмпамі чарапахі

Вынікі напёту ў Мазыры

З давядзеньнем прамфінпляну да варштату мазырскія прадпрыемствы не сьпяшаюць. Буйнейшае прадпрыемства — фанэрная ф-ка «Чырвоны Кастрычнік» пачала праводзіць гэту работу толькі з 23 мая, г. зн. ужо пасьля таго, як пачалася падрыхтоўка да налёту. «Абъектыўныя» прычыны, якія высоўвае адміністрацыя, не заслугоўваюць увагі. Апраўданьні адміністрацыі, што быццам давядзеньню прамфінпляну да варштату перашкаджала падрыхтоўка да пераводу фабрыкі на 7-гадзінны рабочы дзень і адсутнасьць галоўбука, кажуць толькі аб тым, што адміністрацыя вельмі нядбайна аднеслася да выкананьня дырэктывы аб давядзеньні прамфінпляну да варштату.

Толькі з 23 мая прамфінплян распрацаваны для ўсіх цэхаў і асобных варштатаў, прычым вытворчыя заданьні ахапляюць пэрыяд у 5 месяцаў да канца гаспадарчага году. Адначасова арганізуецца ўлік работы асобных варштатаў. Заводзкім арганізацыям трэба будзе пільна прасачыць за тым, каб гэтае ўсё вызначанае было абавязкова праведзена ў жыцьцё.

Такі-ж малюнак на заводзе «Пралетарый». Прамфінплян абгаворваўся толькі на насяджэньні вытворчага сэктару і на вытворчай нарадзе. Да кожнага рабочага прамфінплян не даведзен. Адміністрацыя лічыцца вынесьці у цэхах патрэбныя дыяграмы і лічбовы матар'ял, і таму частка рабочых зусім нічога ня ведае аб сваім прамфінпляне.

Таксама невыстарчальна настаўлена інфармаваньне рабочых аб выкананьні прамфінпляну. Інфармаваньне аб адных колькасных паказальніках ня можа рабочых задаволіць. А інфармаваньне аб якасных паказальніках тармозіцца, паводле слоў адміністрацыі, з прычыны адсутнасьці тэхнэрсаналу (!).

Слабае інфармаваньне рабочых нават стварае думку ў некаторых з іх, што штодзённыя вытворчыя заданьні—справа нерэальная, бо выпрацоўка залежыць ад сырцу, а таму (!) вынікі могуць быць выведзены толькі ў канцы месяца. Вытворчы сэктар нічога ня робіць, каб растлумачыць рабочым гэтае пытаньне.

На фабрыцы «Прафінтэрн» вытворчыя заданьні даюцца асобным цэхам, варштатам і асобным рабочым. Улік выкананьня прамфінпляну робіцца праз кожныя 5 дзён, але толькі па колькасных паказальніках, якасныя-ж паказальнікі ўлічваюцца паквартальна. Тым ня менш і аб колькасных паказальніках рабочыя да 1 мая інфармаваліся толькі штомесячна шляхам вывешваньня адпаведных таблічак. З 1 мая распрацаваны таблічкі для пяцідзённых зводак, але да гэтага часу ня вывешваюцца. Адміністрацыя не сьпяшаецца. Між іншым, давядзеньне пляну да цэхаў і да кожнага рабочага таксама было абгаворана на вытворчай нарадзе і агульным сходзе рабочых зусім нядаўна — у канцы красавіка і пачатку мая.

Мазырскім арганізацыям і гаспадарнікам трэба насьпяшыць з давядзеньнем прамфінпляну ў усімі іх асноўнымі паказальнікамі да варштатаў і рабочых. Да канца гаспадарчага году засталося ўжо мала часу.

МАЗЫРАНІН.

Дайце рабочаму плян

Важнейшая дырэктыва партыі — аб давядзеньні прамфінпляну да кожнага варштату — на запалжавай фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» ігнаруецца поўнасьцю.

Уся работа па давядзеньні прамфінпляну да варштату выявілася ў тым, што бухгальтэрыя напісала цэхавыя калькуляцыі, а фабком гэтыя калькуляцыі зачытаў на агульных сходах рабочых. Праз тры тыдні гэтыя калькуляцыі былі вывешаны ў цэхах, у цёмных кутках. Але рабочыя гэтых калькуляцый ня чытаюць, бо «там шмат незразумелых слоў, лічбаў і косак» — у адзін голас заяўляюць амаль усе рабочыя.

Апрача гэтага, у большасьці цэхаў калькуляцыі завалены розным хламам. У фанэрным цэху да калькуляцыі нельга падыйсьці, бо яна закідана кіпамі фанэры. У набіўачным цэху калькуляцыя застаўлена пустымі варштатамі. У ватэрпасным цэху прамфінплян вісіць у такім кутку, куды не заглядвае ні адзін рабочы. Тое самае ў скрынатным цэху. Таму ні адзін рабочы не адказа на запытаньне — колькі вам цэ павінен зрабіць у месяц скрынак, саломкі, або шчэпы, каб выканаць прамфінплян.

Такое становішча з давядзеньнем прамфінпляну да цэху, а аб давядзеньні прамфінпляну да брыгады і кожнага варштату гаварыць ня прыходзіцца. Наш «трыкутнік» ня можа ніяк зразумець, якім чынам гэта можна давесьці прамфінплян да кожнага варштату.

Рабочыя хочуць ведаць сваю норму паводле прамфінпляну, каб ня толькі выканаць яго, але і перавыканаць. Але безадказныя адносіны да гэтай справы пашага «трыкутніка» зрываюць ажыцьцяўленьне дырэктывы партыі аб давядзеньні заданьня да кожнага рабочага.

П. КАВАЛЁЎ.

Больш сувязі з трымальнікамі пазык

У гэтым месяцы, згодна пастановы ўраду, адбудуцца тыражы масавых пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сельскае гаспадаркі. Яны разыгрываюцца да пачатку кампаніі па абмене масавых пазык на адзіную пазыку «Пяцігодку—за чатыры гады», каб трымальнікі пазык маглі прымаць удзел у тыражох.

У часе тыражоў будзе разыграна вялікая колькасьць выйгрышаў на значную суму. Па першай пазыцы індустрыялізацыі па двух тыражох будзе разыграна 46.600 выйгрышаў на суму звыш 6 млн. руб. У трох тыражох 2-й пазыкі індустрыялізацыі будзе разыграна 326.000 выйгрышаў на суму звыш 35 млн. руб.; па апошнім сэрыйным тыражы пазыкі ўзмацненьня сельскае гаспадаркі—23.300 выйгрышаў на суму звыш 3 млн. руб.

Такім чынам, на працягу 3-4 тыдняў будзе разыграна выйгрышаў на суму больш 44 млн. руб. Выйграўшых будзе каля 400.000 чал., калі лічыць, што кожны трымальнік мае цэлую аблігацыю, на справе-ж выйграўшых будзе значна больш, бо многія набывалі часткі аблігацый. Няма сумненьня, што дзесяткі тысяч выйграўшых знойдуцца і ў БССР.

Камісіям садзейнасьці прыдзецца разгарнуць вялікую работу на праверцы выйгрышаў.

Л—ў.

Пагражаючае становішча з сяўбой ільну ў Полаччыне

На 1 чэрвеня акругай выканана толькі 24% пляну

ТРЫВОЖНЫЯ ЛІЧБЫ

Ход сяўбы ільну ў Полацкай акрузе, якая зьяўляецца самай ільнаводнай у БССР сьведчыць аб тым, што ні акруговыя і ні раённыя арганізацыі не зразумелі сур'ёзнасьці становішча. Яскравей усяго гэта пацьвярджаюць даныя сяўбы на 25-га мая. Калгасы акругі выканалі плян на 11,1%, індывідуальнікі — на 10,3%. Зусім дрэнна ідзе сяўба па самых ільнаводных раёнах. Боркавіцкі раён, напрыклад, выканаў — калгасы — 4,8%, індывідуальны сэктар—4,5%. Калгасы Асьвейскага раёну далі — 5,4%, індывідуальнікі — 8%. Калгасы Дрысенскага раёну выканалі — 13,4%, індывідуальнікі — 15,7%.

Па 25-га мая па акрузе закантрактавана 6.000 гэкт. Між тым, засеяна 651 гэкт. — гэта ў калгасах. Па індывідуальным сэктры закантрактавана 8.395 гэкт., а засеяна — 2.237 гэкт.

Да канца сяўбы засталося ня больш 10 дзён. Калі ў бліжэйшыя дні не адбудзецца рашучы пералом, дык мы станем перад пагрозай значнага недасеву ільну ў Полацкай акрузе.

Трэба адзначыць, што становішча, якое стварылася ў Полацкай акрузе, зьяўляецца вынікам адсутнасьці належнага кіраўніцтва з боку акруговых і раённых арганізацый, якія да самага апошняга часу спадзяюцца на самацёк, на тое, што плян па ільне выканаецца сам па сябе

Побач з гэтым варта адзначыць, што капрэтных мер да ўзмацненьня тэмпу сяўбы тэхкультур у Полацкай акрузе ня было прынята. Рад паведамленьняў з розных раёнаў Полаччыны гаворыць аб тым, што ільготы за сяўбу тэхнічных культур не папуляризаваны як належыць сярод індывідуальнікаў, што навакол пытаньня выкананьня пляну па ільне не мабілізавана ў дастатковай меры і ўвага калгасных мас.

С.

***

Позна вечарам мы атрымалі ад Полацкага акрэа тэлеграму - маланку наступнага зьместу.

«На 1 чэрвеня калгасамі акругі засеяна 1.275 гэкт. ільну — 22,1 проц. заданьня, індывідуальнікамі — 5.390 гэкт. — 24,2 проц. пляну».

Гэтыя лічбы, хаця і сьведчаць аб некаторым павялічэньні засеянай ільном плошчы, але агульны малюнак ад гэтага не мяняецца. Становішча застаецца пагражаючым — зрыў зусім рэальны. Калі Полацкая акруга будзе і надалей рухацца такімі «тэмпамі» (г. зн. выконваць 10-11 проц. заданьня ў пяціднёўку), дык для выкананьня ўсяго пляну будзе патрэбна яшчэ 35 дзён. Між тым, да сканчэньня сяўбы засталося 10-15 дзён.

Патрэбны тэрміновыя і рашучыя меры.

План арганізацыі рабочых агародаў выкананы толькі на 50 проц.

Пастановай Цэнтрасаюзу і ўрадовых органаў БССР рабочая кампанія Беларусі абавязвалася ў сёлетнюю веснавую пасеўную кампанію арганізаваць прыгарадных гародніх гаспадарак на плошчы 1.300 гэкт.

Праз 5-10 дзён сяўба канчаецца ўжо па ўсёй БССР, між тым заданьне рабочай кампаніі па стварэньні рабочых агародаў выканана толькі на процантаў 50. Замест 1.300 гэкт. засеяна прыблізна 650 гэкт. агародаў.

Фактычна арганізацыя прыгарадных агародаў зрываецца. Аднэй з прычын тормазаў у справе стварэньня прыгарадных агародаў зьяўляюцца пяўваж

МЕНСК

123 новыя дактары

Учора ў клюбе харчавікоў адбыўся урачысты вечар, прысьвечаны выпуску мэдфаку БДУ. Мэдфак скончыла 123 чал. Намесьнік рэктара БДУ т. **Вальфсон** і нарком аховы здароўя т. **Цэнцыпэр** у сваіх прывітальных прамовах спыніліся на тэй грамадзкай рабоце, якая чакае на раёне маладых дактароў.

Выступалі яшчэ дэкан мэдфаку т. **Кроль**, нам. НКА т. **Рыўпін**, старшыня саёзу мэдсанпрацы т. **Хэйфэц**, прадстаўнікі партыйнага і камсамольскага калектыву БДУ і прадстаўнік ад рабочых заводу «Энэргія».

Бурнымі воплескамі сустрэлі выпускнікі выступленьні дэлегацыі кітайскага студэнцтва. Тав. **СУ-Пін** перадаў прывітаньне ад імя кітайскага камсамолу і працоўных Кітаю. На прыкладах кітайскай рэвалюцыі т. Су-Пін адзначыў, што інтэлігэнцыя ня можа быць па-за клясавай, яна павінна стаць ці па адзін, ці па другі бок барыкад клясавай барацьбы. Тав. **Тан-Кэ-ін** вітала студэнтаў ад імя працоўных жанчын Кітаю.

Удзельнікі вечару паслалі прывітальную тэлеграму XIII зьезду КП(б)Б.

Выпуск курсаў па падрыхтоўцы рабочых у ВНУ

1 чэрвеня адбыўся выпуск курсаў пры БДУ па падрыхтоўцы рабочых у ВНУ і рабфакі. Курсы скончылі 325 чал. 290 скончыўшых будуць прыняты ў гэтым годзе ў ВНУ, рэшта на рабфак. У гэты-ж дзень адбыўся выпуск падрыхтоўчых курсаў пры шэйнай фабрыцы «Кастрычнік», якія скончылі 62 чал.

Перабудова работы сельсавету

15 чэрвеня МенАВК склікае акруговую нараду сакратароў райвыканкомаў, старшынь раённых бытавых камісій і інструктароў РВК. На нарадзе будуць разгледжаны пытаньні аб **перабудове работы сельскіх саветаў**, у адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, і аб задачах бытавых камісій пры выканкомах і саветах.

Запрашэньне на міжнародны кангрэс

Беларускі Дзяржаўны Оданталёгічны інстытут атрымаў запрашэньне прыняць удзел у работах VIII міжнароднага оданталёгічнага кангрэсу, які адкрыецца ў Парыжы ў 1931 годзе. Інстытут зробіць на кангрэсе рад дакладаў.

7-га чэрвеня а 6 гадз. увечары ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ адбудзецца пасяджэньне **цэнтральнай камісіі па аглядзе грамадзкага харчаваньня.** На пасяджэньне, апрача членаў камісіі, запрашаюцца прадстаўнікі ўсіх газэт, ЦП саюзаў, ВСНГ, МЦРК, Белкалгасцэнтру і рабочыя брыгадзіры, якія праводзілі агляд грамадзкага харчаваньня.

На пасяджэньні будуць разгледжаны наступныя пытаньні: даклад **Белкалгасцэнтру і ЦП саюзу нархарч** «Што даў агляд грамадзкага харчаваньня», даклад ЦП саюзаў будаўнікоў, мэталістых і мэдсанпрацы аб іх удзеле ў аглядзе грамадзкага харчаваньня і аб тэрмінах акруговых канфэрэнцый і ўсебеларускага зьезду па грамадзкім харчаваньні.

Яўка членаў камісіі і вышэйпаказаных прдстаўнікоў абавязкова.

Чаму Гэлерштэйн зрабіў замах на самагубства

Нядаўна зрабіў замах на самагубства загадчык Магілёўскай прафшколы абутнікаў **Галерштэйн.** Прычыны гэтага замаху заслугоўваюць увагі савецкай грамадзкасьці.

За дзень да самагубства на імя бюро парт'ячэйкі рымарнай фабрыкі паступіла заява 4-х вучнёвак прафшколы, якая выкрывала ганебныя здачынныя ўчынкі загадчыка школы, члена партыі **Гэлерштэйна.**

Справа ў тым, што гэты загадчык прымушаў вучнёвак да сужыцьця. Тых вучнёвак, якія адмаўлялі яму, ён выганяў са школы і пакуль яны не аддаваліся, ня прымаў іх назад. Можна прывесьці рад прыкладаў распусных паводзін Гэлерштэйна, які літаральна тэрарызаваў вучнёвак, шырока скарыстоўваў іх наіўнасьць, залежнасьць ад яго і матар'яльную патрэбу.

Дайшло да таго, што Гэлерштэйн, калі ехаў на вёску па справах калектывізацыі, узяў з сабою адну вучнёўку, п'янстваваў там з ёю і апланіў за казённы рахунак яе праезд і ўтрыманьне. На грошы прафшкольцаў ён разам з вучнёўкамі паехаў у Ленінград і наладзіў там шырокую папойку.

Згодна анкеты, Гэлерштэйн — былы грузчык, але грузчыкам ён ніколі ня быў; у анкеце ён даў хлусьлівыя весткі. Ён сын багатага падрадчыка і нічога агульнага з рабочай клясай ня мае.

Каб «вымякчыць сэрцы» членаў бюро, Гэлерштэйн, не чакаючы пастановы бюро, зрабіў замах на самагубства. Ён быў лёгка паранен і зараз ужо вышаў з больніцы.

Ячэйка пастанавіла Гэлерштэйна з партыі выключыць. Зараз гэтай справай павінна заняцца пракуратура. Нельга трымаць на волі злачынцу і распусьніка, які зараз яшчэ жыве ў прафшколе і вядзе разлагаючую работу сярод вучняў.

ЧЛЕН БЮРО.

„АІДА“

(Белдзяржтэатр 1 чэрвеня 1930 г.)

Першы спэктакль опэрнага калектыву, які гасьцюе цяпер у нас, у Менску, паказаў, што ў ім ёсьць рад артыстых-сьпевакоў, якія як з боку музычнага, так і з боку драматычнага (сцэнічнага) могуць задаволіць глядача. Нельга, зразумела, опэры вандроўнай выстаўляць такія запатрабаваньні, якія мы высунем перад опэрай сталай. І ў першую чаргу гэта датычыць знадворнага афармленьня, якое ў опэры вандроўнай заўсёды будзе больш-менш «убогім». Такім яно было і ў «Аідзе» (музыка Вэрдзі).

Невялічкі опэрны хор (15 сьпевакоў) задаволіць слухачоў ня мог. Ён складаецца, бязумоўна, з добрых сьпевакоў, але ён, проста кажучы, незрэпэртаваны.

Затое аркестр гучаў вельмі добра. У асобе дырыжэра Гіскіна мы бачым і чуем таленавітага і культурнага артыстага, які вядзе опэру энэргічна і ўмела.

Балет, што выступаў у опэры,—слабы. Трэба адзначыць дрэнную зрэпэртаванасьць і статыстых, што выяўлялася ў безьлічы розных дробных «клякс», напрыклад, два трубачы на верхнім паверсе канструкцыі ніяк не маглі сваячасова прыкладваць да туб і аднімаць ад іх сваіх труб і гэтым выклікалі з боку публікі досыць гучны сьмех.

На вялікай мастацкай вышыні была перш за ўсё Аіда — Волаж. Артыстка ўладае прыгожым і моцным голасам, які гучыць аднолькава добра ва ўсіх рэгістрах, што сьведчыць бязумоўна аб дасканалай школе. Яна паказала вельмі ўдумлівыя адносіны да сваёй ролі і разуменьне опэры, як драмы.

Сьпявак Емельянаў — Радамэс быў ужо ў нас у Менску 4-5 год таму назад. Ён усё той-жа здольны сьпявак з прыгожым і моцным голасам і добры артысты. У спэктаклі «Аіды», аднак, ён, як быццам, быў ня зусім «у голасе». Адчувалася, што яму чамусьці цяжкавата сьпяваць і былі моманты, калі артысты пяяньне замяніў крыкам.

Надзвычай прыемнае ўражаньне робіць Шыдлоўскі (Рамфіс) сваім сакавітым голасам (бас), якім ён ўладае з поўнай лёгкасьцю, што між басамі зьяўляецца зьявішчам далёка ня частым і што таксама сьведчыць аб добрай школе.

Артысты Аляксашын — Аманасро ўладае прыгожым, хаця і невялікім голасам (барытон). Гэта высока культурны і вельмі музычны сьпявак, з абсалютнай чыстатой інтанацыі, выразнасьцю кантылены і поўнай дакладнасьцю выкананьня сваёй партыі.

Артыстка Корсакава (Амнэрыс) добра вядома Менску па сваіх неаднаразовых прыездах. Бязумоўна, дасьведчаная і карысная опэрная працаўніца, якая ўладае і досыць добрым голасам.

У артыстым Лапаткіну (фараон-бас) адчуваецца здольная, артыстычная, але яшчэ маладая сіла. Голас невялікі, але вельмі прыгожы. У кожным разе артысты патрабуе яшчэ ўпартае працы, бо нават і невялікую ролю фараона ў «Аідзе» можна-ж выканаць «фараоніста».

У абвешчаным кіраўніцтвам опэры рэпэртуары мы бачым опэры выключна старыя, петыя - перапетыя, слуханыя-пераслуханыя. Зразумела, усё гэта высока таленавітыя музычныя творы, але ўсё старыя, а з ідэалёгічнага боку аб іх няма чаго і казаць (можна гаварыць толькі адмоўна). Чаму-б калектыву не пазнаёміць Менск з парачкай і сучасных твораў. Пастаноўка калектывам аднэй-дзьвюх сучасных опэр (Пракоф'ева, Кшэнэка, або хаця-б Шышова) была-б з яго боку ня толькі музычнай, але і грамадзкай паслугай.

І яшчэ адна заўвага адміністрацыі опэры: трэба спэктаклі пачынаць дакладна ў абвешчаны час.

Ю. ДРЭЙЗІН.

Навошта мучыць пасажыраў

Як толькі пачынаецца час адпачынкаў і дачны сэзон, на ст. Менск з году ў год назіраюцца адны і тыя-ж зьявы: даўка, таўканіна, немы крык дзяцей, лаянка, а часамі і самая сапраўдная бойка каля білетнае касы.

Чыгуначная адміністрацыя ў гэтым годзе вынесла касу ў асобнае месца і агарадзіла яе высокім частаколам. У гэтай клетцы і душацца пасажыры, адны ў чарзе каля касы, другія ў чарзе на пасадку. А ў выніку ня ўсе пасажыры попадаюць на цягнік, як гэта было ў 17 г. 40 м. Ці не пара адміністрацыі паварушыць мазгаўнёю ды зрабіць так, каб ня мучыць пасажыраў і не ваняць у іх сорак потаў? Ці можа гэта і трэба так людзям, што едуць адпачываць у Ждановічы?

К.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

— **Дом Камасьветы.** У доме Камасьветы (пак. № 19) — групавая кансультацыя т. **Гольдштэйна** на тэму: «Выкананьне пяцігадовага пляну прамысловасьці (па тэзісах да XVI зьезду УсеКП(б) для дакладчыкаў, якія вылуч. Фрунз. і Кастр. РК. Пач. а 6 г. веч.

— **З 1 чэрвеня чытальня Дому Камасьветы** адкрыта ад 8 гадз. раніцы да 8 гадз. веч. бесперапынна. Габінэты партраб—ад 3 гадз. да 8 гадз. веч.

— **ЖАКТ № 7.** У памяшк. клюбу камунальнікаў (Няміга, № 8) адбудзецца сход камуністых і камсамольцаў, якія жывуць у дамох ЖАКТу № 7. Яўка абавязк. Пач. а 7 г. веч.

— **Беларуская Дзярж. біб-ка.** У памяшк. чытальні Белдзяржбібліятэкі адбудзецца канфэрэнцыя чытачоў біб-кі. Парадак дня: даклад дырэктара біб-кі «Сучаснае становішча і плян разгортваньня Бел. Дзярж. Б-кі з пераходам у новы будынак»; даклад заг. чытальні аб рабоце чытальні. Пач. а 9 г. веч.

— **Ад штабу па культурна-масавым абслугоўваньні выстаўкі сельскае гаспадаркі і прамысловасьці БССР.** На тэрыторыі выстаўкі сельскае гаспадаркі і прамысловасьці (у памяшк. сталовай выстаўкі) адбудзецца парада па культурна-масавым абслугоўваньні выстаўкі. На нараду абавязкова павінны зьявіцца прадстаўнікі культсэктару ЦСПОВ, экскрусбюро пры ПСПСБ, Белдзяржбіблятэцтва, «ГИЗ» РСФСР, газэтнага бюро, Белкаапсаюзу, Выдавецтва Нарфу СССР, Белдзяржбібліятэкі, акрбібліятэкі, радыё-цэнтру, Белдзяржкіно, Гаўмастацтва, ЦС фізкультуры, БДУ, Мвузу, Наркамюсту, пошты, Дзярзэю і Музэю Рэвалюцыі. Пач. нарады а 12 гадз. дня.

ЗАЎТРА

— **Рэсп. Бюро АРУ.** У памяшк. АРУ (Савецкая, 65) адбудзецца чарговаеасядж. прэзыдыуму Рэсп. Бюро АРУ. Запраш. актыў АРУ. Пач. а 7 г. веч.

— **Фрунзаўск. РК МОПР'у.** Пасяджаночай сэкцыі Фрунзаўскага РК МОПР'у На пасядж. павінны зьявіцца бюро яч., а таксама прымацаваныя дэлегаткі. Запраш. жаночы актыў.

— **Да ведама студэнтаў БДУ.** Студэнты і настаўнікі, якія ўзялі кнігі з бібліятэкі вайсковага габінэту БДУ, павінны вярнуць іх не пазьней 6 ч. з прычыны перавучэту і перадачы новаму бібліятэкару.

— **Кастрычніцкі РК КП(б)Б.** У памяшк. клюбу Леніна (вул. Урыцкага) адбудзецца парада сакратароў яч. КП(б)Б, кіраўнікоў сэктараў партасветы і масавых кампаній і прапагандыстаў з наступным парадкам дня: аб хаду прапрацоўкі тэзісаў XVI парзьезду УсеКП(б), аб рэарганізацыі крамнай сеткі МЦРК. Пач. а 6 гадз. увеч.

Прыкладная рабочая праграма і рабочы плян уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі ў калгасах БССР

(Зацьверджана Праўленьнем Белкалгасцэнтру 2-га чэрвеня 1930 г.)

При правядзеньні ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі 1930 году належыць палкам выкарыстаць практыку арганізацыі калектыўнай працы ў калгасах у час веснавой пасеўнай кампаніі. Таму перад прапрацоўкай пляну ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі па скончэньні веснавое сяўбы кожны калгас на агульным сходзе і вытворчых нарадах павінен самым дасканалым чынам праверыць і падагуліць работу па веснавой сяўбе, разгарнуўшы шырокую самакрытыку ўсіх недахопаў ў правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі калгасе і вызначыць шляхі да іх зьнішчэньня.

Асабліва неабходна абмеркаваць недахопы, вынікаючыя з няправільнага разьмеркаваньня работ, беспарадчанай расстаноўкі на работу людзей, інвэнтару, выпадкаў нераспарадчасьці органаў кіраўніцтва калгасаў, безадказнасьці, недысцыплінаванасьці асобных калгаснікаў і г. д. (нявыхады на работу, невыкананьне норм выпрацоўкі, дрэнны догляд за жывёлай і г. д.).

При распрацоўцы пляну падыходзячай уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі калгасам у першую чаргу трэба сканцэнтраваць увагу на арганізацыі догляду за пасевамі (поліва, прапашка, абсышка), а таксама сваячасовай уборцы збожжавых культур і спанажаній, адначасова пя ўпускаючы з-пад увагі падрыхтоўкі папару, уборкі тэхнічных культур, кораньклубняплодаў, пасеву азімых і інш.

Не пазьней 25-га чэрвеня кожны калгас павінен скласьці рабочы плян па ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі. Плян павінен быць падрабязна абмяркован вытворчых нарадах, агульных сходах калгаснікаў і на сходах брыгад з тым, каб кожны калгаснік ведаў, як і ў якія тэрміны будзе праводзіцца ўборачная і асеньняя пасеўная кампанія і які ўдзел ён і яго сям'я будзе прымаць у гэтай рабоце. Яшчэ да пачатку ўборачнай асеньняй пасеўнай кампаніі трэба правесьці падрыхтоўку людзей, асабліва тых, якія будуць працаваць на складаных машынах (жнярвяржах, спонавязалках, малатарнях, сеялках і г. д.). Уборка азімых пасеваў 1929 г., якія знаходзяцца ў паасобным карыстаньні членаў калгасаў, пры іх добраахвотнай згодзе на гэта — праводзіцца сіламі калгасу і ўваходзіць у агульны плян калгасу.

1. Складаньне пляну

Плянам трэба прадугледзець наступнае: а) тэрміны пачатку і скончэньня ўсіх работ па кожнай культуры асобна; б) наяўнасьць у калгасе людзкой і цягавай сілы, с.-г. машын і прылад; в) вызначэньне нормы выпрацоўкі для інвэнтару, цягавай сілы і людзей; г) улічыць наяўнасьць і патрэбу ў людзях, цягавай сіле і с.-г. інвэнтару, выявіць недахоп або лішкі іх; д) утварыць разьбіўку ўсёй пасеўнай плошчы на асобныя вучасткі (у буйных калгасах); е) у выпадках далёкай адлегласьці налёў ад населішчных пунктаў, арганізаваць дастаўку на месцы работы харчоў для людзей і кармоў для жывёлы; ж) разьбіць усю людзкую, цягавую сілу і с.-г. інвэнтар на брыгады; скласьці паасобна брыгады: па догляду за пасевамі, уборцы ўраджаю і сенажацяй, абмалоце, падрыхтоўцы папару і пасеве азімых; і) прымацаваць брыгады да пэўных вучасткаў і даць кожнай брыгадзе заданьне для выкананьня, на ўвесь час уборачных і пасеўных работ, у якім указаць: а) якую работу трэба выканаць і дзе (на якім вучастку); б) пачатак і скончэньне работ; в) нормы выпрацоўкі; г) сьпіс вылучаемых людзей, цягавай сілы і с.-г. інвэнтару.

Максымальна нагрузіць жывы і мёртвы с.-г. інвэнтар, бяручы ў аснову прыкладныя нормы выпрацоўкі для калгасаў (гл. брашуру «Арганізацыя і аплата працы ў калгасах»).

2. Рамонт і набыцьцё с.-г. інвэнтару

Пераглядзець і адрамантаваць да пачатку работ увесь уборачны, глебаапрацоўчы і пасеўны інвэнтар і транспарт, а таксама сваячасова набыць і даставіць нехапаючыя машыны і прылады. Трактары і машыны павінны быць цалкам забясьпечаны патрэбнай колькасьцю гаручага і змазачнага матар'ялу, а таксама павінна быць арганізавана сваячасовая іх дастаўка. Праўленьне павінна сваячасова забясьпечыць машыны запаснымі часткамі, асабліва тымі, якія хутка зношваюцца, а таксама спонавязальным шпагатом. Неабходна адрамантаваць усю збрую і прыстасаваць яе да рабочае жывёлы, сабраць і падладзіць усю існуючую тару. Праўленьне калгасу павінна забясьпечыць сваячасовае атрыманьне і дастаўку мінэральных угнаеньняў.

3. Догляд за пасевамі

Ураджай прапашных культур, бульбы, кораньплодаў і інш., а таксама тэхнічных культур значна залежыць ад дастатковага і правільнага догляду за пасевамі, як поліва, абсышка, прапашка, прарэджваньне і інш. Поліва, прапашку і абсышку прапашных культур трэба ўтвараць пэрыядычна з такім разьлікам, каб не дапушчаць разьвіцьця пустазельля. Для выкананьня гэтай работы арганізаваць спэцыяльныя работчыя брыгады, шырока выкарыстоўваючы пры гэтым жанчын і падростаў.

Арганізаваць ахову пасеваў ад патраў, вылучыўшы спэцыяльных бартаўнікоў. Арганізаваць абкошваньне меж і інш. мерапрыемствы па барацьбе са шкоднікамі.

4. Уборка сеяных траў і сенажацяй

а) Дабіцца перад сельсаветамі і земорганамі адводу сенажацяй не пазьней 20 чэрвеня г. г.

б) Арганізаваць ахову сенажацяй ад патраў.

в) Уборку сеяных траў і сенажацяй правесьці ў пэрыяд найбольшага травастою, не дапушчаючы перасьпяваньня травы і выгараньня мурагу.

5. Падрыхтоўка і ўборка збожжавых культур

Работа па ўборцы збожжа павінна быць праведзена ў карацейшы тэрмін, ні ў якім выпадку нельга дапускаць перастойваньня збожжа, асабліва неабходна пасьпяшацца з уборкай азімых, яравой пшаніцы і ячменю, каб упікнуць абсышкі, а таксама забясьпечыць сваячасовасьць азімага пасеву. Калгасы павінны дабіцца праз земорганы і с.-г. каапэрацыю правядзеньня сваячасовай праверкі якасьці і гатунковасьці сваіх сэлекцыйных і гатунковых пасеваў. Вучасткі, прызнаныя гатунковымі, павінны быць выкарыстаны выключна для пасенных мэт і ўбірацца асобна ад астатніх. У калгасах, дзе ёсьць толькі радковыя пасевы, трэба вызначыць вучасткі з лепшым ураджаем для выкарыстаньня іх на пасеньне, на выпадак неатрыманьня гатунковых пасеваў, а таксама пры абмалоце і сартаваньні адабраць лепшае, найбольш паўнаважкае зерня для насеньня. У тых выпадках, калі ў калгасах пры ўборцы ня будзе хапаць спонавязальнага шпагату, неабходна выкарыстоўваць спонавязалку як жнярвярку (лобагрэйку).

6. Малацьба збожжавых

Малацьба збожжа павінна рабіцца непасрэдна за ўборкай. Азімыя, вызначаныя для пасеву, і ўсё гатунковае жыта абмалочваюцца ў першую чаргу, распачаўшы іх абмалот там, дзе будзе магчыма, непасрэдна на палёх. Праўленьне калгасу павінна паклапаціцца выбарам і падрыхтоўкай месца для такоў пры абмалоце на полі, а таксама падрыхтаваць гумны і хлявы для складаньня спапоў у сьцірты, ачысьціўшы ток і зрабіўшы належны подсьціл для сьціртаў. Адначасова з малацьбой утвараецца ачыстка і сартаваньне збожжа. Пры малацьбе і ачыстцы неабходна сачыць за тым, каб ня была зьмешваньня яравых і азімых культур і гатунковых са звычайнымі. Прывесьці ў парадак збожжахавальнікі, утварыць загадзя іх дэзынфэкцыю. Пасьля першага абмалоту інфармаваць усіх калгаснікаў аб сярэднім ураджаі з гэкт., а таксама аб мяркуемым зборы збожжа ва ўсёй гаспадарцы. На кожным таку пры абмалоце ў складзе брыгады павінны быць вылучаны адказныя прыёмшчыкі абмалочанага збожжа, на абавязкі якіх ускладаецца дакладны ўлік абмалочанага збожжа па гатунках. Аб колькасьці абмалочанага збожжа кожны дзень даюцца весткі ў праўленьне калгасу. Ні ў якім выпадку не дапушчаць ссыпку ў сьвірны сырога збожжа. У выпадку-ж атрыманьня сырога збожжа яго неабходна ссыпаць такім парадкам, каб можна было свабодна ўтвараць перашуфлёўваньне; зрабіўшы пры першай магчымасьці асушку гэтага збожжа. Мякіна, салома і інш. адыход старанна ўбіраюцца і складваюцца ў часе малацьбы. Па скончэньні абмалоту праўленьне разам з актывам калгасу павінна заслухаць на пасяджэньні вынікі абмалоту і колькасьць сабранага збожжа запісаць у пратакол.

7. Ахова ад агню

Каб упікнуць магчымасьці пажару ад неасьцярожнасьці з агнём, а таксама ад магчымых падпалаў клясавага ворага, праўленьне калгасу абавязана: 1) адрамантаваць пажарны абоз, а там, дзе яго няма, сумесна з сельсаветам арганізаваць; 2) прапрацаваць разам з сельсаветам супрацьпажарныя мерапрыемствы; 3) вылучыць дзяжурных людзей для назіраньня і аховы. Распрацаваць спэцыяльныя супрацьпажарныя меры, у прыватнасьці забараніць куреньне на таку, на пэўнай адлегласьці разводзіць агонь, увесьці штрафы за парушэньне супрацьпажарных мер, аж да выключэньня з калгасу; 4) мець на такох пастаянны запас вады. У мясцох валікага скапленьня збожжа ўстанавіць пастаяннае дзяжурства супрацьпажарнай аховы, умовіўшыся аб гэтым з сельсаветам. Праўленьне калгасу павінна прыняць крокі да стварэньня пажарных дружын з калгаснікаў. Арганізацыя і назіраньне за правядзеньнем у жыцьцё супрацьпажарных мерапрыемстваў ускладаецца асабіста на старшыню калгасу, або спэцыяльны - вылучанага члена праўленьня.

8. Падрыхтоўка папару

а) Узьняты папар трымаць у чыстым выглядзе, утвараючы пэрыядычна яго баранаваньне ў мэтах зьнішчэньня пустазельля;

б) сваячасова вызваліць заняты папар ад пасеваў і зараз-жа яго заараць;

в) забясьпечыць сваячасовае баранаваньне і тарфаваньне глебы, вызначыўшы для гэтай мэты пэўныя вучасткі і арганізаваўшы загатоўку і дастаўку ваны і торфу ў гаспадарку.

9. Уборка тэхнічных і прапашных культур

а) У мэтах павышэньня якасьці валакна тэхнічных культур (ільну і канапель) не дапушчаць іх перасьпяваньня;

б) пры ўборцы бульбы і кораньплодаў асаблівую ўвагу зьвярнуць на ўважлівую ачыстку бульбы і кораньплодаў ад баньвіньня і грязі (арганізаваць сартаваньне бульбы пры яе захаваньні). Ссыпку бульбы і кораньплодаў у капцы і падвалы ўтвараць у сухім выглядзе, добра прыкрываючы капцы (саломай, лістам і зямлёй);

в) падрыхтаваць ільна - мачыльныя ямы, ільна - апрацоўчыя машыны.

10. Пасеў азімых і зяблеьне

а) Абмеркаваць і вырашыць парадак складаньня пасенных фондаў для членаў калгасаў неабгаўленых пасеваў для азімага пасеву, вызначыўшы для кожнага члена пэўную норму і тэрміны здачы пасеньня ў фонд калгасаў.

б) забясьпечыць максымальнае пашырэньне пасеўнай плошчы пад азімыя культуры за лік новых зямель (распашка хмызьнякоў, выганаў і інш.);

в) скарыстаць усе магчымасьці да ўтварэньня і пашырэньня радковай сяўбы шляхам максымальнай нагрузкі радковых сеялак, якія ёсьць, набыцьця новых і скарыстаньня сеялак бліжэйшых калгасаў;

г) пасеў утварыць адсартаваным пасеньнем з лепшых гатункаў збожжа, скарыстаўшы ўсе магчымасьці да максымальнага ўвядзеньня і пашырэньня гатункованага пасеву;

д) зяблеьне, а таксама лушчэньне глебы павінны ўтварацца па магчымасьці зараз-жа пасьля ўборкі збожжавых і ў разьмеры плошчы, патрэбнай для пасеву яравых наступнага году. Пры зяблеьні павінна ўтварацца ваннаваньне і тарфаваньне глебы пад яравыя 1931 г.

11. Кармавое пытаньне

а) Сваячасова скончыць набудову сіласных ям і веж;

б) забясьпечыць сваячасовую загатоўку сіласнага матар'ялу і ўтварыць закладку сілясу;

в) зрабіць павярховае палянаваньне сенажацяй (баранаваньне, зрэзка куп'я, ачыстка ад хмызьнякоў);

г) правесьці ўспашку для карэннага палянаваньня сенажаці;

д) скласьці разьлікі патрэбнасьці трубых кармоў і подсьцілу для жывёлы на стойлавы пэрыяд і вызначыць папаўненьне недахвату, калі гэткі будзе.

12. Садоўніцтва і гародніцтва

а) Арганізаваць правільны догляд і ахову саду, а таксама падрыхтоўку да рэалізацыі ўраджаю (загатоўка і ўстаноўка падпор для дрэў, падрыхтоўка скрынь для плодоў і заключэньне дагавароў для рэалізацыі плодоў);

б) падрыхтоўка плошч для закладкі новых садоў і падсадкі старых;

в) падрыхтоўка хавальнікаў для гародніны, а таксама тары, арганізацыя пераапрацоўкі і збыту гародніны.

13. Грамадзкія мерапрыемствы

Пры складаньні пляну ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі ўлічыць неабходнасьць аказаньня дапамогі бяднякім і сераднякім індывідуальным гаспадаркам. Уборачную кампанію і асеньнюю сяўбу праводзіць мэтадам сацыялістычнага спаборніцтва як паміж калгасамі, так і ўнутры калгасаў паміж асобнымі брыгадамі і групамі, а таксама між калгасамі і саўгасамі, арганізаваўшы ўдарныя брыгады з актыву калгаснікаў, камсамольцаў і г. д. Асноўнымі ўмовамі для салспаборніцтва могуць зьяўляцца: а) правільны і сваячасовы догляд за пасевамі; б) хуткасьць уборкі, в) якасьць уборкі, г) хуткасьць і якасьць малацьбы, д) хуткасьць і якасьць пасеву азімых і г. д. Перад пачаткам работ абавязкова робіцца праверка гатоўнасьці калгасу да ўборкі, малацьбы і пасеву. Брыгадзірам правяраецца гатоўнасьць сваёй брыгады, Праўленьнем — гатоўнасьць усіх брыгад, а рэвізійнай камісіяй з удзельнем калгаснага актыву — гатоўнасьць праўленьня.

Кожны брыгадзір штодзенна паведамляе праўленьне аб выкананай яго брыгадай рабоце. Праўленьне калгасу ў сваю чаргу павінна ставіць у ... масьць усіх членаў калгасу аб хаду ўборкі і абмалоту, а таксама падрыхтоўцы пасеву азімых, дзеля чаго яны вольныя ад работы часы, прыкладам праз 5 дзён, знаёміць калгаснікаў з дам работ і становішчам работы па ... на ў добра і дрэнна працуючых брыгадах. У часе ўборачнай і пасеўнай кампаніі ўсе члены праўленьня і рэвізіі ... місіі калгасаў павінны быць прыкрэплены да важнейшых вучасткаў работы ... стала знаходзіцца пры іх, прымаючы непасрэдны ўдзел у рабоце.

Веснавая пасеўная кампанія, зьяўляючыся першай кампаніяй масавай калектыўнай сяўбы, суправаджалася рядам сур'ёзьнейшых недахопаў у ... практыцы. Таму павінны быць павялічаны патрабаваньні большай арганізаванасьці, выразнасьці работы і адказнасьці за выкананьне ўскладаемых задач як у адносінах да ўсіх калгасаў, ... калгаснікаў, кожнага калгаснікаў, і калгасных аб'яднаньняў. Усе калгаснікі павінны яскрава прадстаўляць ... ключную важнасьць надыходзячай уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі ... справе ўзмацненьня калгаснага руху не забываць аб тым, што клясавы враг — кулак імкнецца прарваць ... ныя вучасткі сацыялістычнага будаўніцтва.

Дружнай арганізаванай працай калгаснікаў, умелай садзейнасьцю і ... ніцтвам з боку калгасных арганізацый ... асеньняй пасеўнай кампаніі — ... цуем калгасы і дамо рашучы адпор клясаваму ворагу — кулацтву.

УВАГА: Формы рабочага пляну ... раз друкуюцца Белкалгасцэнтрам.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМО...

ЦП САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ

паведамляе, што 7-га чэрвеня, а 8 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу «Саўгандальслужачых» склікаецца

ЗЬЛЁТ УСЯГО КУЛЬТАКТЫВУ САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ:

рабкораў, сьпенкораў, рэдкалегій насьценгазэт, культкамісій, клюбных працаўнікоў, брыгадзіраў па дапамозе ў правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі МК.

У ПАРАДКУ ДНЯ: прапрацоўка пытаньняў аб культ. абслугоўваньні спрэваздачна-перавыбарчай кампаніі МК і рапарту асобных МК, зве ёсьць чырвоны куткі, аб прыстасаваньні апошніх да правядзеньня гэтай кампаніі.

На даны зьлёт павінны зьявіцца акрамя вышэй пералічанага актыву члены МК і ГК, а таксама ўсе члены саюзу.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР | Гастролі 1-га Маскоўскага перасовачнага тэатру ОПЭРЫ І БАЛЕТУ

Сёньня, 4 чэрвеня **„РИГОЛЕТТО“** опэра ў 4 дз. муз. Вэрдзі.

Пачатак а 8 г. 30 м. увеч.

Тэатр саду „Прафінтэрн“ | Мастацкі перасовачны тэатр **„КРАСНЫЙ ФАКЕЛ“**

Чацьвер, 5 чэрвеня, для саюзу працаўсьветы **„Человек с портфелем“** п'еса ў 4-х дзеях Файко.

КІНО Вітрыцкага — Мастацкая кіно-аповесьць **ВЕЦЕР у ТВАР**

Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г.

Звыш праграмы **кіно-штомесячнік Белдзяржкіно „Беларусь Савецкая“ № 6, прысьвечаны XIII зьезду КП(б)Б.**

У нумары: 1. Менская акруговая партканфэрэнцыя. 2. Адчыненьне XIII зьезду КП(б)Б. 3. Асінбуд. 4. Зорныя взлёсы пэдныя прабегі. 5. Універс. гарадок. 6. 25-гадовы юбілей літаратарэйнасьці Янкі Купалы. 7. Масавая экскурсія на Днепрабуд.

КІНО САД (Савецкая. 71) — Нямецкі фільм Паводле навелі СТЭФАНА ЦВЭЙГА. **СТРАХ** драма ў 8 частках. Пачатак 1-га сэансу а 9 г., 2-га 10 г. 30 м. Каса з 6 гадз.

КІНО Рэвалюцыя — 2-гі ТЫДЗЕНЬ ТРУКАВЫ КІНО-РАМАН **МІС МЭНД** 2 серыі—11 частак у адзін сэанс. У галоўнай ролі **Ігар Ільінскі** Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. — Каса з 5 гадз.

1-кы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр“ — Мастацкі фільм у 2-х озрыях—12 частках. **„КРАСНЫЕ ДЬЯВОЛЯТА“** Абедзьве серыі ў адзін сэанс. Пачатак 1 сэансу з 2-х гадз. Каса з 12 г.

КІНО Спартак — НЯМЕЦКІ ФІЛЬМ **ВІНАВАТЫ** (СУДОВАЯ ПАМЫЛКА) У галоўнай ролі **Бэрнгард Гэтцке.** Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. КАСА—АД 5 Г. 30 М.

БАБРУЙСКАМУ ДАРАДДЗЕЛУ ПАТРАБУЕЦЦА ЭКАНАМІСТЫ са стажам. **АКЛАД ПЭНСІІ ПА ЗГОДЗЕ.**

Фактычныя выдаткі па пераезьдзе з сям'ёй на месца працы аплачваюцца аддзелам.

Жадаючых заняць гэту пасаду просьба дасылаць заяву з апісаньнем аўтабіяграфіі па адрасе: гор. Бабруйск, Пушкінская, 52, Аддзеддзелу.

Камісія садзейнічаньня Дзяржкрэдыту пры Менскім Белпэдтэхнікуме просіць усіх выпускніноў, за якімі лічыцца запазычанасьць па 3-й пазыцыі індустрыялізацыі, ліквідаваць да 10 чэрвеня.

УВАГА!! **Хто яшчэ ня бачыў?** УВАГА!!

ВЫСТАЎКА ДРУКУ

ПРЫ ГАБІНЭЦЦЕ ЖУРНАЛІСТЫКІ КАМВУЗУ імя Ў. І. ЛЕНІНА **ПРАЦЯГНУТА ДА 10 ЧЭРВЕНЯ**

выстаўка рэарганізавана і папоўнена новымі экспанатамі

Наведваньне выстаўкі штодня ад 4 да 10 г. увечары як экскурсіям, так і індывідуальна — ЭКСКУРСІЯМ КАНСУЛЬТАЦЫЯ —

Усе на выстаўку друку!

Габінэт журналістыкі КУБ.

ЗЬБІРАЙЦЕ ЛЕКАВЫЯ ТРАВЫ!

Вучні школ і піянэр-атрады! Арганізуйце брыгады па зборы лекавых траў. Не давайце гінуць у палёх сотням тысяч рублёў!

Збор лекавых траў— **ДОБРЫ ЗАРАБОТАК** для дзяцей беднаты.

Белмэдгандаль у бягучым годзе, як і ў мінулыя гады, ПРАЗ УСЕ АПТЭКІ ў раёнах і ў гарадох Беларусі купляе высушаныя лекавыя расьліны: валер'ян, белену, тал